Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ВК і СНК БССР

№ 143 (4076)
ЛІПЕНЬ
2
ПАНЯДЗЕЛАК
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Инв. 2675

СЁННЯ У НУМАРЫ:

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б—АБ ХОДЗЕ СЕНАЎБОРКІ, СЕНАЗДАЧЫ ДЗЯРЖАВЕ І СІЛАСАВАННЯ.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—АБ ПІСЬМАХ І СКАРГАХ ПРАЦОЎНЫХ. АНТОНАЎ—НАША ЗАДАЧА—ДАЦЬ ЗДАРОВЫ ПАРАВОЗ І ВАГОН. Р. ДОДЗІН—ЗА СЦЯГ «ПРАВДЫ». БУТОМАЎ—ДАРОГУ РЭВЕНЮ.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ: М. РАБЦЭВІЧ—НЕ ЗРАЗУМЕЛІ РОЛІ ІНСТРУКТАРА. ВІШНЕЎСКІ—АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ У КРЫЧАЎСКІМ СЕЛЬГАССНАБЕ.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ.

БАРАЦЬБА Ў ФАШЫСЦКІМ ЛАГЕРЫ АБВАСТРАЕЦЦА.

СКАРЫСТАЦЬ КОЖНУЮ ГАДЗІНУ ДОБРАЙ ПАГОДЫ ДЛЯ СЕНАЎБОРКІ

НЕ ДАПУСКАЦЬ РАЗРЫВУ ПАМІЖ КАСЬБОЙ І СТАГАВАННЕМ

ПАВОДЗЯЧЫ ІНДЫВІДУАЛЬНУЮ ЗДЗЕЛЬШЧЫНУ НА КАСЬБЕ, КАЛГАСЫ ПАВЯЛІЧАЦЬ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ КАСЦА МІНІМУМ НА 30-40%

АБ ПІСЬМАХ І СКАРГАХ ПРАЦОЎНЫХ

Наша Совецкая краіна кіруецца мільёнамі. Велізарнейшая сіла пролетарскай дыктатуры, узнаўляемай ленінскай партыяй, у тым і заключаецца, што яна (дыктатура) апіраецца на мільёны, што яна ўцягвае ў кіраўніцтва мільёны працоўных. Формы ўдзелу мас у кіраўніцтве краінай разнастайныя—праз советы, профсаюзы, кааперацыю, комсамол, розднага роду грамадскія інспекцыі, соцыялістычных намеснікаў і т. д.

Сіла пролетарскай дыктатуры ў крытыцы і самакрытыцы. Буржуазія баіцца крытыкі мас, баіцца крытыкаваць свой апарат. Пролетарская дыктатура, улада Совецкаў не толькі не баіцца крытыкі і самакрытыкі, але, наадварот, у гэтай крытыцы мас, у штодзённай самакрытыцы сваіх недахопаў і памылак чэрпае новыя сілы, знаходзіць новыя сродкі для павышэння сваёй боездольнасці.

Адной з нямалаважных форм удзелу мас у кіраўніцтве краінай, у разгортванні крытыкі і самакрытыкі з'яўляюцца **пісьмы працоўных**. І сапраўды. Аб тым пішуць рабочыя, калгаснікі, працоўныя, пішуць у газеты, у совецкія органы, у партыйныя камітэты, у профсаюзы, у пракуратуру, бюро скаргаў і т. д.? Яны пішуць аб засмечанасці калгасных, кааперацыйных і іншых кадраў класавадушныя элементамі, аб **скарыўленнях** лініі партыі і совецкіх законаў пасобнымі работнікамі совецкага, кааператыўнага і іншых апаратаў. Яны пішуць аб пасаромленнях, зловживаннях, аб фальшывым адміністраванні [illegible] Паўстае пытанне: ці можа **большэвік** быць раўнадушным да гэтых скаргаў і пытанняў працоўных?

Адносінах партыі і совецкай улады да чэлюскінцаў лішні раз прадэманстраваны ленінскія, сталінскія адносіны да **працоўнага грамадзяніна краіны Совецкаў.** Крэпе Совецкаў адналькава дораг**кожны** працоўны яе грамадзянін. Вось чаму на выратаванне сотні чэлюскінцаў былі мабілізаваны дырыжаблі, аэрапланы, ледаколы. Узагароджваючы чэлюскінцаў, совецкая ўлада не рабіла розніцы паміж прафесарам Шмідтам і цесляром, кухарам, паміж гідрахімікам Лобза і прыбіральшчыцай Мілаваўскай. Для яе, паўтараем, адналькава дораг кожны працоўны грамадзянін.

Мы пытаемся: хто-ж даў права, хто дазволіў парушаць совецкія законы і крыўдзіць працоўных? Хто даў права **не адказваць, не прымаць мер па скаргах працоўных?** А ё нас часта які-небудзь **старога свету, аб якой ахвосце пішуць у сваіх пісьмах працоўныя.**

Ад пісьмы працоўных маюць і яшчэ адну надзвычай важную тэму. Іх выкладзены **скаргі і патрэбы працоўных.** Аднаго няправільна звольлі; другой не выплацілі канчатковай кампенсацыі за нескарыстаныя выходныя дні; трэцяму не выдаюць аблігацый, хоць грошы даўно ён ужо выплаціў; чацвертая скардзіцца на зацяжку з пачаткам зарплаты; пяты—на агідную работу школы і так далей і да таго падобнае. Паўстае пытанне: ці можа **большэвік** быць раўнадушным да гэтых скаргаў і патрэб працоўных?

Адносінах партыі і совецкай улады да чэлюскінцаў лішні раз прадэманстраваны ленінскія, сталінскія адносіны да **працоўнага грамадзяніна краіны Совецкаў.** Крэпе Совецкаў адналькава дораг**кожны** працоўны яе грамадзянін. Вось чаму на выратаванне сотні чэлюскінцаў былі мабілізаваны дырыжаблі, аэрапланы, ледаколы. Узагароджваючы чэлюскінцаў, совецкая ўлада не рабіла розніцы паміж прафесарам Шмідтам і цесляром, кухарам, паміж гідрахімікам Лобза і прыбіральшчыцай Мілаваўскай. Для яе, паўтараем, адналькава дораг кожны працоўны грамадзянін.

Мы пытаемся: хто-ж даў права, хто дазволіў парушаць совецкія законы і крыўдзіць працоўных? Хто даў права **не адказваць, не прымаць мер па скаргах працоўных?** А ё нас часта які-небудзь **старога свету, аб якой

Чырвоны сцяг нямецкага пролетарыята

З прыходам да ўлады фашысты ў Германіі прынялі нямала захадаў, каб знішчыць комуністычную літаратуру і газеты. Увесь рабочы друк забаронены друкарні ўзяты на ўчот; ім забаронена друкаваць легальныя газеты; на граніцах, паязды створаны заградзіцельныя атрады для таго, каб марксісцкая літаратура не магла ў Германію трапіць нелегальна.

На кастрах палілася рэвалюцыйная літаратура. Праводзяцца маёвыя вобыскі ў пошуках забароненых кніг, журналаў, газет. За гэтым следуюць арышты, абвінавачанні за кожны знойдзены лісток ці газету.

Аднак, комуністычны друк, не гледзячы ні на якія перашкоды, шырока распаўсюджваецца як у горадзе, так і на вёсцы. Комуністычныя газеты выходзяць нелегальна і сталі ўжо сур'ёзнай дапамогай комуністычнай партыі Германіі ў барацьбе супроць фашысцкага тэрора.

ЦО КПГ „Ротэ фанэ" Чырвоны СЦЯГ выходзіць нерэгулярна.

Шмат трудасцей і перашкод перамяжанакаб нерэгулярна выдаваць „Ротэ фанэ". Германскія комуністы гэтага дабіліся. Яны і ў падполлі захавалі свой маёвы орган, які пастоянна вядзе барацьбу супроць фашызму і соцыял-фашызма, за пролетарскую рэволюцыю.

Лік рабкораў і тыраж „Ротэ фанэ", не гледзячы на жорсткі тэрор і праследванні, увесь час расце. Рабочыя Германіі любяць сваю газету і дапамагаюць ёй.

На здымку: Першая старонка **„Ротэ фанэ"** з заклікам: „Няхай жыве чырвоная першамайская барацьба 1934 года". Пад загалоўкам: „Наш тавараш і правадыр Эрнст Тэльман" — партрэт тав. Тэльмана, а з трабаваннем вызвалення яго з фашысцкіх засценкаў.

„Ротэ фанэ" друкуецца на тонкай паперы фатаграфічным спосабам.

Adrano April 1934 Kampf gegen den Unternehmer-Vertrauensrat (Siehe im Blatt) Preis ..

Die Rote Fahne

Zentralorgan der Kommunistischen Partei Deutschlands (Sektion der Kommunistischen Internationale)

Genosse! Leser! Trotzende aus Deinem Bekanntenkreis suchen neuen Anschluß an die kämpfende Front des Proletariats. Sage deinen Freunden und Bekannten, daß sie die „Rote Fahne" abonnieren sollen.

Reichsausgabe Begründet von Karl Liebknecht u. Rosa Luxemburg

Lesen - Weitergeben!

Genosse! Leser! Denke daran, daß diese Zeitung hinter dem Rücken von Leute aus den Spitzenbunden der faschistischen Reaktion geschaffen ist. — Lese sie aufmerksam durch. — Gib sie weiter an Deine Arbeitskollegen.

Es lebe der rote Kampf-Mai 1934!

Nieder mit der faschistischen Kapitalsdiktatur! Nieder mit ihrem Arbeiter-Verfassungsgesetz! Es lebe die Diktatur des Proletariats!

Aus der Feuerlinie erbitterten Klassenringens, inmitten einer von Waffenlagern und schwelendem Kriegsbrand erfüllten Welt des Kapitalismus, rufen die Kommunistische Partei, der Kommunistische Jugendverband und die Revolutionären Gewerkschaftsorganisationen zum Internationalen Kampftag der Arbeiterklasse, zum roten Kampfmai 1934 auf.

Die Krise des sterbenden Kapitalismus macht das Leben der werktätigen Massen zu einer Hölle des Elends, des Hungers und der Not. Faschistisches Abenteuertum und kapitalistische Profitmacherei reichen sich die Hände, um auf dem Wege terroristischer, unterdrückung und imperialistischer Kriege den Untergang des Kapitalismus hinauszuschieben.

Gegen Terror, Faschismus und imperialistische Kriegspolitik formiert sich die Front der Ausgebeuteten und Unterdrückten in allen kapitalistischen Ländern. Es schwillt die Welle des Hasses. Es reift der Wille zum

Sturmangriff gegen die Herrschaft der kapitalistischen Schmarotzer

Sie sich über Spanien, Frankreich, Polen, USA, Belgien ausbreitende Massenstreikwelle, die heldenhaften Aufstandskämpfe des österreichischen Proletariats künden das Herannahen entscheidender Klassenschlachten. Der rote Kampfmai 1934 vereinigt die Kämpfe der Arbeiter aller Länder mit den erhabenen und siegreichen Siege in der Sowjetunion und dem Befreiungskampf Sowjet-Chinas Gegen Kapitalismus u. faschistischen Gluterrore, gegen chauvinistische Volksverhetzung und imperialistischen Krieg erhebt das Proletariat unter den Losungen der Kommunistischen Weltpartei das

Banner des proletarischen Internationalismus!

Für die Befreiung des Bannerträgers des deutschen Revolution, des Genossen Ernst Thälmann! Für die Befreiung unserer gefangenen und gemarterten Brüder in allen Ländern des Kapitalismus! Für die Verteidigung unseres Vaterlandes der Sowjetunion!

Für den Sturz des Weltkapitalismus. Für die Errichtung der Sowjetmacht!

Auf 15 Monaten Hitlerdiktatur steht aus dem Ehrenlanbel vom „Deutschen Sozialismus" und „Volksgemeinschaft" immer offener und brutaler die Fratze reaktionärer Kapitalsdiktatur hervor. Lohn- und Unterstützungsraub, Teuerung und Massensteuern, Zwangsanleihen und Arbeitsdienst, Konzentrationslager, Folter und Arbeitermord, das haben die Hitler, Göring und Göbbels den Armen gebracht. Gesetzlich ausgenommen von Besitzsteuern, riesige Subventionen für Finanz- und Agrarkapital, Höchstprofite und Sicherung der arbeits- und mühelosen Einkommens das schenkte Hitler den Reichen und Nichtsteuern.

Die Hitler, Goerlinge und Göbbels

Unser Genosse und Führer gefoltert!

Genosse Thälmann gefesselt im Dunkelarrest - Nur Massensturm, Protestflut und Betriebsaktionen retten sein Leben

Der Führer des deutschen Proletariats, Genosse Ernst Thälmann, wurde unmittelbar nach der Ermordung seines engsten Freundes John Schehr und seiner drei Kameraden aus dem Untersuchungsgefängnis Moabit nach Göttingen berüchtigter Folterhölle, in das Columbia-Haus geschleppt. Auf Grund vorausgegangener Lügenbeschuldigungen des Polizeipräsidenten Kattner sollte Thälmann abermals Aussagen machen, insbesondere über seine Beziehungen zur Komintern. Standhaft lehnte der Führer des deutschen Proletariats jede Aussage vor SS-Leuten und SS-Banditen ab. Am Abend des Mordes an John Schehr und Tage danach haben ihn die Nazi-Bestien auf grausamste Art gequält und gefoltert. Auf Göttings und Hitlers Befehl schlugen sie mit Reitpeitschen, Gummiknüppeln, Eisenstücken und schweren Koppeln auf unseren wehrlosen, geliebten Führer ein. Tagelang dauerte die Folter.

Wochenlang dauerte es, bis die Geschäftsverlegungen einigermaßen gewischt waren. Dann brachte man ihn nach dem Untersuchungsgefängnis Moabit zurück. Hier wurde er nach einem vorausgegangenen Provokationsversuch eines als angeblichen Gefangenen in seine Zelle geschickten Gestapo-Banditen abermals grausam mißhandelt. Seit diesem Tage liegt er an Händen und Füßen gefesselt und angekettet in einer berüchtigten Mordzelle im Dunkelarrest zur Gestapo-Beamte die sich im Dienst abwechseln, haben Zutritt zu ihm.

Die deutsche Arbeiterklasse — eng revolutionärer mit Thälmann verbunden — sich wie ein Mann zur Rettung des Lebens ihres geliebten Führers erheben. Ihr Ausgebeuteten in den Fabriken, auf den Werften und in den Kontoren! Eurer Führer will man ohne Prozeß plötzlich vernichten! Man gibt ihm Gift ein wie das bei einem Angeklagten aus dem Reichstagsbrand-Prozeß bereits erprobt wurde. Die braunen Henker wollen ohne Prozeßverfahren den Führer des antifaschistischen Massenbewegung Deutschlands durch qualende Folterungen körperlich zugrunde richten, weil er als Bannerträger des faschistischen Befreiungskampfes sich den tödlichen Haß der braunen Kapitalisten, der Krupp und Thyssen und deren Lakaien, des Haß der Hitler, Göring und Göbbels zuzog.

Arbeiter und werktätige Bauern Deutschlands! Führt Protestaktionen durch! Beschimpfe die Berliner Gestapo und das Untersuchungsgefängnis Moabit mit euren Massenprotesten! Tritt in den Betrieben Proteststreikaktionen beschließt Streiks zur Rettung des Lebens und der Freiheit eures Führers! Bilder Thälmann-Befreiungskomitees unter Einbeziehung der sozialdemokratischen und christlichen Klassengenossen Ueberfliegt das Gefängnis besonders am 16 April, dem Geburtstage Thälmanns mit revolutionären Zuschriften. Immer bei Thälmann für euch gekämpft. Kämpft auch für ihn ein und damit für den Sturz der Hitlerdiktatur, für die Freiheit für die Macht der Arbeiterklasse. Für den Sozialismus

АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ У КРЫЧАЎСКІМ СЕЛЬГАССНАБЕ

Двары і склады Крычаўскага аддзялення Белсельснаба завалены іржавымі, некамплектнымі або зусім вышаўшымі з моды машынамі. Тавар ляжыць грудамі на лаўках і пад лаўкамі. Чаго толькі тут няма! Кампедрабілкі, зерняплюшчылкі, дзіравыя пажарныя бочкі па 217 руб. (у Клімавічах у арцелі робяць цэлыя па 150 рублёў), рознастайны выбар тачыльных каменняў. Праўда, яны такога размеру, як жорны ў млыне. Ёсць і каткі для калёс па 78 руб. за стан (у кааперацыі 50 рубл.). Ёсць і шыны на каткі, толькі даюць іх таму, хто бярэ стан каткоў на складзе Белсельснаба, а не ў кааперацыі (Касцюковічы). На падлозе ляжаць кучы запасных частак невядомага прызначэння. Ці яны да жняярак, ці да паравозаў — цяжка разабрацца. І ляжаць таму па некалькі год. Тут можна знайсці чарапічны прэс, гноераскідвальнікі, каткі дарожныя і т. д. Больш чым на 60.000 рубл. такіх некамплектных машын валяюцца па некалькі год пад снегам і дажджом, урастаюць у траву.

Каля паўтары тысяч хамутоў знайшлі сабе тут прытулак. Ніхто іх не трывожыць, і ляжаць яны спакойна. Праўда, мышы гнёзды ў некаторых звілі, крыху пагрызлі. А хамуты, можна сказаць, шыліся, на лес гледзячы. Павесь любы з іх на браме і гані каня — конь свабодна праскочыць праз яго. А каму такі хамут патрэбен? Невыгадна... Запражы каня, адвязе ён цябе ад сяла, а потым вылузаецца з хамута — і памінай як звалі. І ляжаць яны таму нерухомым капіталам.

Тут-жа в запасными часткамі груды лапат, чапёл, патэльняў.

Усё што хочаш можна знайсці на складах крычаўскага аддзялення Белсельснаба. А складаў ажно 7 — у Крычаве і Клімавічах, Касцюковічах і Чэрыкаве, Чырвонаполлі і Прапойску і нават у Мсціславе. І ўсюды, як на Сарочынскім кірмашы. Ні пралезці, ні прайсці. Не возьмеш сам, сілай даруць. Прыехаў, скажам, ты купляць жняярку, а табе гавораць:

— Вазьмі бульбакапалку ці бульбасаджалку, дадзім жняярку. Калі вы вопытны, дык можаце ўнікнуць гора. Паклічце загадчыка складам Балюкова, калі гэта ў Крычаве будзе, а калі ў Касцюковічах, дык паклічце Швыдкала і ціха скажыце:

— Калі я вам мяшочак бульбы падкіну, можна будзе тады жняярку ўзяць без гэтай бульбачарпалкі?

Лягодная ўсмешка распаўзецца на іх тварах.

— Калі вы ўжо такі добры чалавек і вельмі жадаеце бульбы мне падкінуць, то я нічога супроць не маю... Бярыце жняярку, але каб было шыта-крыта, — і адазваўшы куды-небудзь у цёмны куток, прыгрозіць:

— А калі разбалтаеш, то другі раз кампедрабілку прымушу ўзяць.

Так і размеркавалі ўсе жняяркі на Крычаўскім складзе, па запісачках, — за бульбу, а не таму, хто даваў заяўку.

Народ цяпер разасціўся, цапамі не хоча малаціць, а ўсё наравіць, каб малатарняй. Малатарань няма, не завозяць... Чаму-б, скажам, не скарыстаць кампедрабілку, якая ў Клімавічах вось ужо больш пяці год стаіць. Камень такі моцны, і то малоціць. Трэба толькі мець сякую-такую кемнасць, і ўсе машыны са складаў Крычаўскага аддзялення Бельсельснаба, якія стаяць без скарыстання па поўдзесятка год, можна выкарыстаць для ўборачнай.

А людзі не жадаюць думаць, хочуць усё гатовым атрымаць. Так і ляжыць усё гэта недатыкальным фондам. І машыны розных сістэм і канструкцый, і лапаты, і чапёлы, і каткі, і лапці, і патэльні, і розны шырпатрэб больш, чым на 150 тыс. рублёў. Ніхто не купляе. Цэны гавораць высокія. Можна згадзіцца. Узяць хоць-бы лапату. У кааперацыі яна каштуе ад 70 кап. да рубля. У Крычаве на складзе Белсельснаба — 1 р. 93 к., у Чырвонаполлі — 2 р. 35 к., а ў Прапойску — 2 р. 79 к. Патэльня ў Крычаве на складзе каштуе 2 рублі, у Чырвонаполлі 8 р. 50 к. Кожны склад на адны і тыя-ж запасныя часткі і шырпатрэб мае свае цэны. У далёкіх ад чыгункі пунктах, Чырвонаполлі і інш. самыя высокія цэны. Але не заўсёды. Чапяла ў Крычаве, якая каля самай чыгункі каштуе 1 р. 23 к., у Прапойску каштуе 75 к. Вось і разбярыся... Вядома, што ніхто пераплачваць не жадае. І тавар ляжыць, а ў аддзялення грошай няма.

За сустрэчныя перавозкі людзей прыцягваюць да адказнасці. Можа дзе каго-небудзь і прыцягвалі, толькі не работнікаў Белсельснаба і не ў Крычаве. Усе машыны для 7 раёнаў ідуць у Крычаў. Тут іх выгружаюць, плоцяць грузчыкам грошы. Потым пачынаецца бегаціна. Патрабуюць зноў вагонаў, каб машыны адправіць у Клімавічы, Касцюковічы, на ст. Ходасы для Мсціслава. А чаму-б нельга даваць адазу заказ, каб, скажам, вагон жняярак для Клімавіцкага раёна, які везлі праз станцыю Клімавічы, адчапілі на месцы, а не везлі іх у Крычаў. А з Крычава да Клімавіч іх зараз будуць адпраўляць цэлых два месяцы. Тое-ж самае і з вагонам малатарань для Мсціслаўя. Можна было даць заказ да станцыі Хадасы і вагон пашоў-бы. А то адчапілі, выгрузілі. Атрымаць зноў вагон для перакідкі не кожнаму ўдаецца.

Яшчэ лепш атрымалася з мяшаткамі для кос. Робяць іх у Хоцімску (Касцюковічы). З Хоцімска прывезлі на склад у Касцюковічы. З Касцюковіч забралі ўсе да адной менташкі, завезлі ў Крычаў. У Крычаве Рубін (заг. аддзялення) памацаў, панюхаў іх, аддзяліў належную порцыю для Касцюковіцкага раёна:

— Зараз можаце зноў везці іх у Касцюковічы.

Вось так і возяць машыны з месца на месца. Можна было расказаць, як на складах залежваюцца запасныя часткі да ўборачных машын толькі таму, што на іх па два месяцы расцэнак не даюць (нажы для жняярак і касілак на складах у Клімавічах і Касцюковічах), як загадчык клімавіцкага склада Гаможа па 20 дзён не выхупляе са станцыі грузаў... Але досыць. Раскажаш усё, ды да ўсяго дасі параду, аб чым-жа будуць думаць людзі ў Белсельснабе?

М. Вішнеўскі.

АД РЭДАКЦЫІ:

Зняшчаючы карэспандэнцыю тав. ВІШНЕЎСКАГА, «Звязда» чакае, па-першае, ад загадчыка Белсельгасснаба неадкладных мер, якія-б паклалі канец згіднасцям як па Крычаўскаму, так і па другіх аддзяленнях Белсельгасснаба. Па-другое, рэдакцыя чакае, што КРЫЧАЎСКІ РК І РАЙПРАКУРОР у самым тэрміновым парадку расследуюць факты, прыведзеныя ў артыкуле тав. Вішнеўскага. У правінасці, ПАВІННЫ БЫЦЬ АДДАНЫ ПАД СУД ХАБАРНІКІ з крычаўскага аддзялення Белсельгасснаба.



ЛЁДАРЭЗ «ЛІТКЕ» 27 ЧЭРВЯНЯ ВЫШАЎ У НОВУЮ АРКТЫЧНУЮ ЭКСПЕДЫЦЫЮ З ВЛАДЗІВАСТОКА.

НА ЗДЫМКУ: ЛЁДАРЭЗ «ЛІТКЕ» ПЕРАД ПАДНЯЦЦЕМ ЯКАРА.

НЕ ЗРАЗУМЕЛІ РОЛІ ІНСТРУКТАРА

ВІЦЕБСК. (Ад спецыяльна карэспандэнта «Звязды»).

У Віцебску адбылася кітайская нарада інструктароў Віцебска, Сіроцінскага, Лёзненскага, Гадоцкага, Суражскага і Бешанковіцкага раёнаў. Кожны выступаючы гаварыў, як ён кіруе нізавымі партарганізацыямі, як праводзіць партыйна-выхаваўчую работу, а вывучае і ці вывучыў жывых людзей, кіруе імі і дапамагае ім у рабоце.

Нарада дала многа інструктарам. Яна выявіла недахопы, якіх уольшасці інструктароў надавычаймнога. Асноўны недахоп састаіў у тым, што рад не толькі інструктароў, але нават і раённых камітэтаў партыі не зразумелі сутнасці ролі інструктара, а гэта значыць не зразумелі наогул сутнасці перадовы партыйнай работы.

Гэта асабліва ярка выявілася в інфармацыйнай інструктароў Суражскага і часткова Бешанковіцкага райкомаў. Вось факты. Інструктар суражскага РК тав. Масленнікаў абслугоўвае 7 сельсоветаў. У зоне яго дзейнасці 32 комуністы. Якую партыйна-масавую работу праводзіў гэты інструктар? Літаральна ніякай.

Да пачатку сяўбы ён арганізаваў раённы агляд коней, праверку гатоўнасці раёна да сяўбы, злёты адказнасобнікаў. У пачатку сяўбы ён паслан упаўнаважаны РК у Стыкаўскі сельсавет, дзе і прабыў увесь час веснавой пасеўнай кампаніі.

Вось інструктар Баразна. Зона яго дзейнасці — 6 сельсоветаў. З 18 кастрычніка ён сядзеў упаўнаважаным РК у Запольскім сельсавеце, пакуль закончылі сяўбу. Сядзела ўпаўнаважаным і інструктар Бешанковіцкага райкома т. Мельнікава.

Устае пытанне — ці будзе інструктар ведаць, што робіцца ў тых ці іншым калгасе яго зоны, ці зможа ён кіраваць нізавой партыйнай арганізацыяй? Зразумела, не. У Віцебскім раёне, у калгасе «Чырвоная армія», Елагінскага сельсавета, у пагоні за новымі формамі работы ўстанавілі сцягі трох колераў: чырвоныя, сінія (а ў некаторых брыгадах чорныя) і белыя. Гэтыя сцягі расставіліся на ўчастках работы асобных брыгад. Імі вымяралася і ацэньвалася работа асобных ударнікаў.

Гэта — самы горшы від апашлення соцспаборніцтва. Тут, зразумела, без рукі класавага ворага не абышлося. Між тым, інструктар гаркома тав. Гічамараў даведаўся аб гэтым толькі на куставой нарадзе інструктароў з інфармацыі партгрупорга калгаса тав. Эльберта.

Ды і дзе яму ведаць, калі ён усю вясну, як і інструктар Суражскага райкома, прасядзеў упаўнаважаным пасеўнай кампаніі і перакідваўся райкомам з сельсавета ў сельсавет, нават не яго зоны дзейнасці. Іменна гэтым тлумачыцца і тое, што амаль ва ўсіх сельскіх партыйных арганізацыях гэтага раёна праваліена партыйная вучоба і прапрацоўка рашэнняў XVII партыйнага з'езда. Іменна гэтым тлумачыцца тое, што інструктары райкомаў не ведаюць сваіх людзей, не выхоўваюць і не мабілізуюць іх на выкананне гаспадарча-палітычных задач.

На нарадзе інструктароў высветліўся яшчэ такі факт. Інструктар райкома павінен кіраваць, дапамагаць партыйным арганізацыям арганізоўваць партмасавую работу, выхоўваць комуністаў і беспартыйных. Для таго-ж, каб інструктар справіўся з гэтай задачай, ён павінен вучыцца сам. Ці прадстаўлена магчымасць інструктарам вучыцца? Не. Аб гэтым у адзін голас заявілі амаль усе інструктары, якія прысутнічалі на нарадзе. У тым-жа Суражскім раёне за ўвесь час работы інструктароў, райком ні разу не склікаў іх і не пагаварыў, як інструктары павінны працаваць. Прызначылі пябе інструктарам — ну і працуй сабе як хочаш.

У Бешанковіцкім раёне за працягу ўсёй вясны з інструктарамі не праводзілася ніякая работа.

— Толькі зараз пачалі арганізоўваць вучобу, — заяўляе інструктар Мельнікава: — але праводзіцца яна нерэгулярна. Сакратар райкома тав. Камдан толькі ў канцы чэрвеня правёў нараду з інструктарамі. Да гэтага-ж часу ніякага кіраўніцтва не было.

— Не праводзяцца заняткі з інструктарамі, — заяўляе інструктар Лёзненскага райкома тав. Кавгасі. — Большасць інструктароў, нават не прысутнічае на пасяджэннях бюро райкомаў. Інструктары Бешанковіцкага раёна, паводле слоў т. Кампуса, ні разу не былі на пасяджэннях бюро райкома. Тое-ж самае і з інструктарам Масленнікавым, Суражскага раёна.

Ці здолее такі інструктар забяспечыць своечасовае і аператыўнае ажыццяўленне рашэнняў бюро райкома? Зразумела, не. Ды ён іх і ведаць не будзе. З гэтым згодны і самі інструктары.

«Дырэктывы райкома, асабліва па лініі райзямаддзела, не выконваюцца»—заявіла тав. Літвінава інструктар Горацкага райкома.

Прыведзеныя факты выразна сведчаць аб тым, што ў гэтых раёнах не толькі інструктары, але і сакратары райкомаў партыі не зразумелі задач, якія стаяць перад інструктарам, не зразумелі сутнасці работы інструктара, а разам з гэтым і перабудовы партыйнай работы. Два інструктары віцебскага райкома па сельскай гаспадарцы зай маліся няма ведама чым, але толькі не сваёй непасрэднай работай.

М. РАБЦЭВІЧ.

НАША ЗАДАЧА— ДАЦЬ ЗДАРОВЫ ПАРАВОЗ І ВАГОН

Вагона-паравозны рамонтны завод імя Ланцуцкага расце з кожным днём. Паасобныя цэхі (вагоны) па ўзраўнаму аб'ёму работы, колькасці рабочых становяцца буйным прадпрыемствам. Завод абагаціўся новай тэхнікай, накапляе вопыт і стаў сапраўдным заводам Саюза па забеспячэнню краіны паравозамі, вагонамі і запаснымі часткамі для рухавога саставу.

Калі мы ў 1933 годзе выпускалі ўключна новыя пашатовыя вагоны, то са студзеня 1934 года мы перайшлі выключна на капітальны і сярэдні рамонт вагонаў. Зусім натуральна, што нам прыйшлося перабудаваць сістэму і структуру работы вагона цэха, для таго каб завод без перабояў выконваў дзяржаўнае заданне.

Але работа першага месяца паказала, што справы ідуць у нас не лепш. Вагонны цэх за студзень дадаў 24 вагоны. Прыйшлося глыбіна узяцца за гэты важнейшы цэх, буйнілі брыгады. Калі раней у брыгадзе працавала 35 чалавек, рамонт рамонту вагонаў быў вельмі лёгкі, г. зн. прыбывала 50-60 вагонаў, людзі раскідаліся па ўсяму гастку. Гэта стварала абязлічку ў рабоце, вялікі брак, мітусню.

Зараз у брыгадзе па 5-6 чалавек. Стаўлена адказнасць брыгадзіраў і рабочых за сваю работу, увесь час графік, як закон выканання пачнага задання. Гэта адразу паднячыла прадукцыйнасць працы на 1 проц.

Аднак і на сённешні дзень вагонны цэх застаецца самым «вузкім» участкам у нашай работе. Калі з 7 цэхаў нашага завода навучыцца больш-менш працаваць роўнамерна, культурна з месяца ў месяц, то выконваць вытворчыя праграмы,—паравозна-зборачны, дрэвапрацоўчы, кавальскі і ліцейны цэхі — май перавыканалі праграму,—то вагонны цэх яшчэ дагэтуль не выканяе з 5 паласы штурмаўшчыны і 5 месяцаў недадаў 130 вагонаў.

Характэрныя даныя трымаліся ў 1 пасля фатаграфіі работы і паасобных брыгад рабочых у вагонным цэху. Фатаграфіі рабочых на рамонту хадавых частак паказалі групаванне: прастоі на віце рабочага складаюць 9 проц., у паасобных выпадках даходзяць да 24 проц., на працаць 103 мінуты рабочага дня. Прастой, які выклікаецца нерэгулярнасцю падачай матэрыялаў, падрыхтаванасцю рабочага месца, страту 25 проц. рабочага часу, ды чынам рабочы час на рамонту хадавых частак прадукцыйна карыстан усяго на 64 проц. Зараз узяліся за правільную арганізацыю работы, за тое, каб рабочы

АНТОНАЎ
НАЧАЛЬНІК ЗАВОДА ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА

працаваў у нас не менш 420 мінут. Мы прымацавалі 40 інжынераў і тэхнікаў да гэтага цэха для дапамогі ў паляпшэнні ўсёй работы.

Пастанова ўрада і ЦК ВКП(б) аб перасоўванні інжынераў і тэхнікаў у цэхі, брыгады, з'явілася для нашага завода рашаючым фактарам для ўзняцця высокаякаснай работы. На самай справе 120 інжынераў сядзелі ў нас у канцылярыях і займаліся пісаніной, а ў пматлікіх цэхах, там дзе робіцца прадукцыя, не было ніводнага інжынера. Зараз большасць інжынераў і тэхнікаў працуе у нас у брыгадах і паказваюць вельмі добрыя рэзультаты. Дастаткова сказаць, што калёсны цэх нашага завода на працяту доўгага часу не выходзіў з прарыву, недадаў дзяржаве 1000 пар калёс. Усе займаліся гэтым цэхам, усе вынучалі, пачынаючы ад наркома і канчаючы дзесяткам камісій. Пасля ўсяго пратаколы раслі, а калёсны парк змяншаўся.

Але пасля таго, як на чале цэха быў пастаўлен тэхнік комуніст тав. Саўкін, цэх пачаў выконваць вытворчую праграму. Зараз цэх з месяца ў месяц перавыконвае праграму за першы квартал. Калёсны цэх выканаў план на 103,67 проц. Ён красавік месяц на 127 проц. за май— на 111 проц. І самыя вялікія заслугі тав. Саўкіна заключаюцца ў тым, што ён змог зрабіць з учарашніх чорнарабочых—тэхнічна пісьменных, свядомых, культурных, спаяных рабочых калектыў.

Трохтысячны калектыў па-сур'ёзнаму ўзяўся за барацьбу за высокую якасць паравозаў, вагонаў, запасных частак, за гонар маркі завода імя Ланцуцкага. Мы маем першыя поспехі. Калі раней паравозы пасля другой пробы давалі да 60 дэфектаў, дык зараз пасля рамонта паравозы ідуць у адну пробу, г. зн. робяць адзін прабег, гэта дала найвялікшую эканомію дзяржаве ў запале і сродках. Гэты першы паказальнік, што рабочыя зборачнага цэха навучыліся лепш рамантаваць паравоз.

Мы вядзем барацьбу за якасць прадукцыі не толькі адміністратыўнымі мерамі, але і шляхам узбраення кожнага рабочага і камандзіра нашага завода ведамі, высокай культурай і тэхнікай. Пачын ленінскага комсамола аб грамадскім тэхнічным экзамене, становіцца справай усіх рабочых нашага завода.

Зараз рабочыя пачалі больш сур'ёзна займацца паляпшэннем якасці работы. І не толькі якасцю рамонту паравозаў, але і знешнім афармленнем вагонаў і паравозаў. Рабочыя ўносяць свае карэктывы, фарбы у афарбоўку вагонаў.

Як сур'ёзны недахоп на нашым заводзе трэба адзначыць адсутнасць уласнай лабалаторыі.

Па ўмовах нашай работы у нас няма спецыяльнага канструктарскага бюро, аднак, наш тэхнічны аддзел выдзеліў спецыяльных інжынераў, якія займаюцца гэтым пытаннем, праўда, зусім недастаткова. Нядаўна, напрыклад, работнікі тэхнічнага аддзела сканструявалі тры паравых молаты. І ўсё гэта з'яўляецца для нашага завода зусім недастатковым. Нам прыдзецца сур'ёзна заняцца гэтым пытаннем, каб мы тэхнічна не адставалі ад іншых перадавых прадпрыемстваў.

Пастанова Саўнаркома і ЦК ВКП(б) па забеспячэнню запасных частак для чыгунак паставілі перад нашым заводам задачу даць у гэтым годзе 1850 тон запасных частак, пры чым калі раней мы выпускалі запасных частак у танажы, то зараз нам патрэбна выпусціць камплектна колькасць па спецыфікацыі: балты, гайкі. Гэта значна ўскладняе работу і мы зараз давялі планы да асноўных цэхаў, устанавілі графік работы і прымем усе неабходныя меры, каб выканаць гэта дзяржаўнае заданне.

Рашэнні пленума ЦК аб рабоце прамысловасці рэспублікі, артыкул сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало узялі работу нашага завода на павышэнне тэмпаў, на паляпшэнне якасці работы. І завод імя Ланцуцкага пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і палітаддзела чыгункі ліквідзе свае недахопы і заваёўвае сваё палажэнне перадавога завода рэспублікі.

З ПАСЯДЖЭННЯ ШТАБА ПА ДАПАМОЗЕ ШКОЛЕ ПРЫ РЭДАКЦЫІ „ЗВЯЗДЫ"

ПАДРЫХТОЎКА ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА У МЕНСКУ ЗРЫВАЕЦЦА

Да пачатку новага навучальнага года засталося толькі 2 месяцы. Здавалася-б, што ў Менску падрыхтоўчая работа павінна была-б ісці поўным тэмпам. На справе-ж, на апошнім пасяджэнні штаба па дапамозе школе пры рэдакцыі «Звязда» з усёй відавочнасцю высветлілася, што на баявую сустрэчу навучальнага года не мабілізавана не толькі пролетарская грамадскасць Менска, але не мабілізаваліся пасапраўднаму і самі органы нарасветы на чале з Менскім гарадскім аддзелам нарасветы (загадчык т. **Кузняцова**).

Усё кіраўніцтва рамонтам школ з боку гарадскога аддзела асветы выразілася выключна ў размеркаванні грошай па школах. Лясными і іншымі будаўнічымі матэрыяламі школы не забяспечаны. Менскі гарэа яшчэ ў снежні мінулага года адпусціў на рамонт і школьнае будаўніцтва 1.500 кбм. лесу, але Менскі гарана іх не атрымаў. На Серабранцы з... 1929 года «будуецца» школа. Тэмпы работ Менбуда не забяспечваюць скончэнне будаўніцтва не толькі да пачатку заняткаў у школах, а і да сакавіка 1935 года.

Школы Менска дагэтуль не ведаюць, колькі з новага навучальнага года ў іх будзе класаў, колькі дзяцей ім трэба прыняць. Настаўнікі дагэтуль яшчэ не ведаюць, дзе хто з іх будзе працаваць.

З дакладаў на пасяджэнні штаба і з матэрыялаў рэдакцыі, відаць, што шэфы школы—менскія фабрыкі і заводы ў большасці запамяталі аб тым, што адказнасць за падрыхтоўку школ да навучальнага года нясуць і яны. Чаго варты, напрыклад, «клопаты» аб падшэфных школах завода імя **Варашылава** (сакратар парткома тав. **Дэйч**, старшыня заўкома т. **Андрэеў**, дырэктар **Шоўкаў**, сакратар комсамольскага калектыва **Базарынаў**). Варашылаўцы ў красавіку першымі адгукнуліся на заклік рабочых завода **«Дынамо»** аб уключэнні ў падрыхтоўку да навучальнага года, узялі на сябе рад абавязацельстваў па дапамозе падшэфным школам і выклікалі на соцыялістычнае спаборніцтва заводы **«Комунар»**, **«Большэвік»** і некаторыя іншыя прадпрыемствы.

Але абяцанні засталіся абяцаннямі. Варашылаўцы палец аб палец не ўдарылі ў справе падрыхтоўкі падшэфных школ (№ 8 і № 20) да навучальнага года; у іх дагэтуль нават не прыступілі да рамонту памяшканняў.

25 узорная школа рэарганізуецца ў базавую школу Наркомасветы. Школа патрабуе рамонту, папаўнення габінетаў, пераабсталявання палітэхнічных майстэрняў, яе трэба ўкамплектаваць высокакваліфікаванымі кадрамі настаўнікаў-метадыстаў. Усё гэта трэба прарабіць. Але 25-я школа (дырэктар **Сілаў**, намеснік **Егораў**) пакуль што ніякай падрыхтоўчай работы і не распачынала. Наркомасветы ўсё яшчэ збіраецца адпусціць сродкі на дабсталяванне гэтай школы, а Менскі гарана на рамонт не адпусціў ніводнай капейкі. Школа не загатовіла нават дроў на зіму. Кіраўніцтва школы супакойвае сябе, што яшчэ паспее гэта зрабіць. У 25-й школе 28 класаў, у базавай павінна застацца з падрыхтоўчым класам—11, а што рабіць з астатнімі вучнямі, дагэтуль невядома, як і невядома хто з настаўнікаў застаецца працаваць у школе.

Узорная 25 школа ў глыбокім прарыве, а шэф--майстэрні малога рамонту вагонаў МББ чыг. усю сваю дапамогу падшэфным падменьваў вылучэннем соцнамесніка, які, да рэчы, у школе зусім не паказваецца.

Мала чым лепш справа з падрыхтоўкай у **21-й менскай школе.** Дагэтуль гарана не даў указання, колькі і ў якія класы трэба прыняць дзяцей, колькі класаў наогул будзе з новага навучальнага года ў школе. Неўкамплектавана яна і педагогамі. Рамонт у школе не пачынаўся. Шэф 21-й школы — Эльвод у асобе старшыні заўкома тав. **Каханоўскага** на пасяджэнні штаба заявіў, што яны з 1 ліпеня прыступаюць да рамонта школьнага памяшкання, дапамогуць школе вывезці дровы, пашырыць электрыфікацыю, адрамантаваць варштаты ў прышкольных майстэрнях, і вылучаць фонды гародніны і іншых прадуктаў для арганізацыі гарачых сняданняў.

Яскравым прыкладам, што ў справе падрыхтоўкі да навучальнага года многае залежыць ад ініцыятывы і гаспадарлівасці кіраўніцтва школы, служыць **13-я непоўная сярэдняя школа.** Пры тых-жа умовах, што і па астатніх школах Менска, дырэктар 13-й школы т. **Дзятко** здолеў не толькі скончыць рамонт аднаго будынка, але паспявае весці будаўніцтва прыбудовы на тры класных пакоі. У 13-й школе паспелі ўжо вывезці пяцэць вагонаў апалу, выкупіць усе вышаўшыя з друку падручнікі, закупіць такую-ж колькасць спыткаў, што іх хопіць на ўвесь навучальны год, а таксама загатовіць іншыя пісьмовыя прылады. Менскі гарана абавязан вопыт 13-й школы папулярызаваць сярод загадчыкаў гарадскіх і сельскіх школ, разам з тым дасягнаваць сродкі на выкананне ўсіх намечаных па гэтай школе работ.

На пасяджэнні штаба з усёй яркасцю выяўлена, што падрыхтоўка да навучальнага года па Менску ідзе вельмі дрэнна. Адказнасць за гэта ў першую чаргу ляжыць на Менскім горсавеце, які, да рэчы, дагэтуль «не паспеў» нават абгаварыць на пасяджэнні прэзідыума пытанне падрыхтоўкі.

Менскі гарадскі камітэт партыі павінен узяць пад свой неаслабны контроль падрыхтоўку да адміністрацыйных работ навучальнага года. На дапамогу шэфам павінна быць мабілізавана ўся пролетарская грамадскасць першую чаргу шэфы-прадпрыемствы.

М. ЛЕНЦНЕР.

В. ЗАИЦ

К—3116.

У БЯГОМЛІ МІФІЧНЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ШКОЛЫ

ЗМЯШЧАЕМАЯ НАМІ КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ ТАВ. **УЛ. ЭЛЬ** ЛІШНІ РАЗ ПАЦВЯРДЖАЕ, ШТО З НАЦЫЯНАЛЬНЫМІ ШКОЛАМІ Ў БССР СПРАВА НЕБЯСПЕЧНА. МІЖ ТЫМ, НЕ ГЛЕДЗЯЧЫ НА СІГНАЛ «ПРАВДЫ» І РАД МАТЭРЫЯЛАЎ «ЗВЯЗДЫ» **НАРКОМАСВЕТЫ БССР** ЗАХОЎВАЕ АЛІМПІЙСКІ СПАКОЙ. АБО, МАБЫЦЬ, ТАВАРЫШЫ З НАРКОМАСВЕТЫ ЛІЧАЦЬ ШТО «НЕАСЛАБНА ПРАДАЎЖАЦЬ БАРАЦЬБУ З ШАВІНІЗМАМ» НЕ ЎВАХОДЗІЦЬ Ў ЗАДАЧУ НАРКОМАСВЕТЫ?

«ЗВЯЗДА» ЧАКАЕ ГЛАСНАГА АДКАЗУ НАРКОМАСВЕТЫ АБ ТЫМ, ЯКІЯ МЕРЫ ЁН ПРЫМАЕ ДЛЯ ВЫПРАЎЛЕННЯ ТЫХ ПАМЫЛАК Ў СПРАВЕ ПРАВЯДЗЕННЯ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ МЕЛІ МЕСЦА Ў СІСТЭМЕ НАРКОМАСВЕТЫ І, Ў ПРЫВАТНАСЦІ, НА ЎЧАСТКУ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ШКОЛ.

У **БЯГОМЛЬСКІМ** раёне была адзіная яўрэйская школа. У гэтай школе вучыліся дзеці калгаснікаў, рабочых і саматужнікаў. Летась школа позна пачала заняткі. Не было настаўніка. Нарэшце Наркомасветы прыслаў яўрэйскага настаўніка.

Радасныя дзеці сабраліся ў школу. Сумная прышла настаўніца **Фрыдман Раіса**. Да яе на родай мове звярталіся дзеці. Настаўніца стаяла і глядзела шырока раскрытымі вачмі. Яна не ведала яўрэйскай мовы. Яна вучылася ў беларускім педтэхнікуме, рыхтавала сябе для работы з беларускімі дзяцьмі. Але яе выклікалі ў Наркомасветы і паставілі толькі адно пытанне: хто яна па нацыянальнасці. Фрыдман сказала, што яна яўрэйка. Вось так яна і стала настаўніцай у яўрэйскай школе. Пакутвала Фрыдман, ламалі мову дзеці, блыталіся. Урэшце кінулі хадзіць у школу.

У сярэдзіне навучальнага года ў Мсціж (дзе працавала Фрыдман) Прыехаў сталічны хлапец. Яго прозвішча, як гэта высветлілася пазней, было **Ханін**.

Ханін прыехаў, каб стаць на работу ў шавецкай арцелі. Там не было месца. Ханіну не было куды ехаць. Ён штодзень мяняў кваліфікацыю. З надыходам вясны рыхтаваўся стаць марожанікам.

Пры першай сустрэчы Фрыдман запытала ў Ханіна—можа ён настаўнік. Няўдачлівы шавец аказаўся «старым, са стажам, педагогам». Фрыдман радавалася і цягнула Ханіна за рукавы ў райана. У аддзеле асветы людзі даверлівыя. Ім няма чаго правяраць дакументы. Інспектар **Давідовіч** выпісала пуцёўку і ўручыла яе Ханіну. У яе сумнення не было—Ханін яўрэй. А раз яўрэй, чаму яму не быць настаўнікам?

Нам невядома, чаму і як Ханін вучыў дзяцей. Мы толькі ведаем, што гэты «педагог» са стажам хутка засыпаўся. І вось як гэта здарылася. Настаўнік арганізаваў «вечар анекдота» сіламі ўласнымі і школьнікаў. Запрасіў бацькоў.

На сцэну ўзняўся Ханін і загадаў бацькам такую загадку, што бацькі чырванелі і не маглі адзін другому глядзець у вочы. Ім было сорамна ад таго, што яны пачулі ад настаўніка.

Каб даць чытачу некаторае ўяўленне аб гэтым выпадку, прывядзем першы **кавалак з прамовы** настаўніка:

— Мы зараз пачнем спаборніцтва,—сказаў кандыдат у марожанікі,—спаборніцтва дзяцей з бацькамі. Выйграе гэта спаборніцтва той, хто адкажа на пытанне: якая розніца паміж бутылкай і ...

У нас не хапае адвагі цытаваць далей прамовы гэтага выключнага педагога.

Бацькі прывялі міліцыянера. Апошні, праслухаўшы пару загадак, прышоў у ярасць. Міліцыянер кінуўся да педагога, педагог нагой выбіў вакно і знік у змроку местачковай ночы. Больш ён у мястэчку не паказваўся. Дзеці засталіся беспрытульнымі—вярней—бязшкольнымі. І так яны хадзілі да канца навучальнага года.

Дарэмна раённыя арганізацыі перавозілі паперу і грошы, дарэмна прасілі яўрэйскага настаўніка ў Наркомасветы—нічога не вышла.

Раён мае 20 проц. польскага насельніцтва. Для дзяцей палякаў арганізавана 5 нацыянальных польскіх школ. Але гэтыя школы з-за адсутнасці настаўнікаў паступова, з года ў год ператвараюцца ў беларускія. Вось школа ў вёсцы **Цядань**. Яна польская. Але што ў ёй ёсць польскага, акрамя вучняў і шыльды? Нічога. Настаўнік **Лісічонак**, калі яму дзеці гаворыць «Бардзо дзенькуем», адказвае: «Ты мне не дзінькай, а гавары толкам». Лісічонак не ведае ніводнага польскага слова, а лічыцца настаўнікам польскай школы.

У вёсцы **Гаравец** (калгас «Орка») жывуць выключна палякі. Ёсць там і школа, якая ў райана і ў Наркомасветы лічыцца польскай пачатковай школай. Настаўнічае тут **Гарбатоўская**. Яна сама прызнаецца, што ёй цяжка працаваць у школе, бо яна не ведае мовы дзяцей. Адным словам: выкладчыца не разумее дзяцей, а дзеці не разумеюць выкладчыцы.

Тое-ж самае і ў **Бярозкаўскай** польска-нацыянальнай школе.

Школы — не выключэнне. Гэта толькі адзін з прыкладаў таго, як у раёне абслугоўваюцца нацменшасці, як ажыццяўляецца нацыянальная палітыка партыі.

Баптысты і сектанты, карыстаючыся адсутнасцю ўсякай інтэрнацыянальнай работы, разгортваюць шалёную дзейнасць. У раёне не працуе ні адна хата-чытальня, ні адзін дом соцкультуры. Няма чырвоных куткоў, няма брыгадных чытчыкаў газет.

УЛ. ЭЛЬ.

ДАРОГУ РЭВЕНЮ!

Рэвень... Гэта назва вядома шырокім масам. Ёсць такая расліна, карэнні якой служаць добрым лекавым сродкам.

Пад Самаркандам, Алма-Атай, Семіпалацінскам вялікія абшары пакрыты дзікімі зараслямі **рэвеня**. Водзіцца ён і ў іншых абласцях Саюза.

Яшчэ да рэволюцыі памешчыкі-аматары разводзілі рэвень, як дэкарацыйную, лекавую расліну. Любы батанік адкажа вам, што рэвень належыць да сямейства грэчкавых раслін. Ён сваёй галоўкай сапраўды нагадвае грэчку, а шырокімі лістамі напамінае звычайны лапух.

Але хто ведае ў нас, што рэвень можа служыць добрым харчовым прадуктам? Мала хто! Між тым у Англіі і Германіі рэвень даўно разводзяць, як харысную гародніну. Яго шырока ўжываюць як харчовы прадукт у рэстаранах, у кандзітэрскай прамысловасці. Пад Лонданам сотні гектараў адведзены пад гэту расліну.

26 чэрвеня на нарадзе пры «Звяздзе» прадстаўнік Усесаюзнага інстытута расліннаводства тав. **ТЕТЕРАЎ**, навуковыя работнікі Балотнай станцыі і навукова-даследчага інстытута харчовай прамысловасці праф. **АДАМАЎ**, тт. **АКСЕНЦАЎ, МАРОН, ШЫПЕРКА, ПРОХАРАЎ** і інш. пазнаёмілі менскую грамадскасць і работнікаў харчовай прамысловасці з уласцівасцямі рэвеня, як харчовага прадукта, як дадатковага віду сыравіны.

Рэвень можа расці амаль усюды, ад палярнага круга да трошкаў, ад Хібінагорска да Самаркандa. Гэта скромная, непатрабоўная расліна развіваецца вельмі хутка, расце на адным месцы шмат год, дае багаты ўраджай — да 22 тон з гектара. Асабліва пышна распускаецца яна на балотнай глебе, на нізінных тарфяніках, якіх так многа ў БССР.

Чым карысны рэвень? Якое яго гаспадарчае значэнне? У яго чарэнках ёсць вітаміны і карысныя кіслоты. Па свайму хімічнаму складу чарэнкі рэвеня пэўных гатункаў набліжаюцца да мясцовых аблыгатовак. У пераапрацаваным выглядзе яны ідуць на выраб начынкі для цукерак, павідла, мармалада, вялення. Яны лёгка паддаюцца брожэнню і могуць даць добрае смачнае віно. З рэвеня можна зрабіць высокакасны прахладжальны напітак — рэвеневы сок.

На многіх украінскіх фабрыках рэвень ішоў на выраб мармалада. У лабараторыі менскага навукова-даследчага інстытута харчовай прамысловасці вырабляюць з рэвеня піцэннае павідла.

Шмат дарагой сыравіны можа з'эканоміць ужыванне чарэнкоў рэвеня ў харчовай прамысловасці!

Вялікую карысць даюць і іншыя часткі расліны. Лісты рэвеня могуць ісці на сілос, а з карэнняў атрымліваецца добрая жоўтая фарба і дубіцель.

Гэтыя ўласцівасці рэвеня, як мы ўжо адзначалі, мала каму вядомы. У нас у БССР гэтай расліной ніхто сур'ёзна не займаўся, не папулярызіраваў яе ў масах. Нядарма калгаснікі глядзяць на рэвень, як на звычайны, нікому непатрэбны лапух.

З нічым неабгрунтаваным недавер'ем адносяцца да яго і работнікі нашых гаспадарчых арганізацый.

Кансерватызм, інертнасць, дзеўдоўскія настроі, так знаёмыя нам пры першых вопытах укаранення соі ў Саюзе, ёсць і на гэтым участку.

Наркамснаб БССР заняўся развядзеннем рэвеня. Пры кандзітэрскіх фабрыках ужо засеяна да 40 гектараў. У Лошыцы занята пад рэвенем да 2,5 гектараў.

Фабрыка **«Комунарка»** першай у БССР пачала ўжываць рэвень, як начынку для цукерак.

Але гэта толькі першыя саматужныя спробы. Рэвень яшчэ не ўзаконен, як кантроўны від сыравіны, ён не заваяваў сабе права грамадзянства, не заняў належачага яму ганаровага месца ў сыравінным балансе нашых прадпрыемстваў.

Нарада падкрэсліла неабходнасць шырокай папулярызацыі і ўкаранення рэвеня ў калгасах і прыгарадных гаспадарках, кантрактацыі яго пасеваў. Наркамзем БССР і кіраўніцтва ўпаўнаважанага НК соўгасаў павінны ўключыць рэвень у дзяржаўны пасеўны план. Ён павінен увайсці ў жалезны фонд соцыялістычнага земляробства. Органы Наркамзема абавязаны заняцца глыбокім вывучэннем гатункаў рэвеня і яго селекцыяй.

Дарогу рэвеню на калгасныя і соўгасныя палі!

Ф. БУГОМАЎ.

ПІСЬМЫ рабочых і калгаснікаў

СТАРШЫНІ СЛУЦКАГА РАЙПРОФСОВЕТА т. ВІШНЕЎСКАМУ.

КАЛІ СКОНЧАЦЦА ЗДЗЕКІ?

(ПІСЬМО РАБОЧАГА)

З 1922 года я працаваў манцёрам 1-га акалодка 713 дарожнага ўчастка (г. Слуцк). За ўвесь час сваёй работы я не меў ні аднаго спагнання і заўвагі.

У лістападзе 1932 г. захварэла жонка. Мне 9 дзён прышлося быць у больніцы каля хворай. На гэта я меў больнічны бюлетэнь.

Але зусім нечакана роўна праз 6 месяцаў, 10 красавіка 1933 г. начальнік участка **Куркузаў** зняў мяне з работы за прагул.

Жаліўся ў Слуцкі ўчастковы камітэт саюза шасейна-дарожных рабочых. Там мне ветліва сказалі, што знят я няправільна.

Пасля гэтага я падаў заяву начальніку ўчастка аб аднаўленні на рабоце. Мне ў гэтым адмовілі. Адмовілі мне, калі я падаў і другую заяву. Матыў? Няма месц.

Пасля звальнення выселілі з кватэры. Так я з сям'ёй з малымі дзецьмі вось ужо поўтода знаходжуся без работы і прытулку.

Усе мае стараннi дабіцца аднаўлення на рабоце не далі вынікаў.

ЦІМОХ КОЎГА.

СТАРШЫНІ РЭЧЫЦКАГА РАЙПРОФСОВЕТА ТАВ. РЫЎКІНУ

ПЯЦЬ ГОД БУДУЕЦЦА ШКОЛА

(ПІСЬМО НАСТАЎНІКА)

З 1929 года ў мястэчку **Холмічах**, Рэчыцкага раёна, будуецца двухпавярховы будынак пад школу.

У мінулым годзе з-за адсутнасці будаўнічых матэрыялаў будаўніцтва спынілася. У гэтым годзе ёсць і матэрыялы, і рабочая сіла, а будаўніцтва зноў чамусці спынена. Рабочыя ходзяць без работы і збіраюцца зусім кінуць. Зарплата рабочым выплачваецца не акуратна.

Раённыя арганізацыі ў сваіх пастановах і планах кожны год пішуць: да новага навучальнага года закончыць будаўніцтва холмічанскай школы. Не гледзячы на гэта, кожны год знаходзяцца «аб'ектыўныя прычыны», з-за якіх будаўніцтва адкладваецца на наступны год. І так пяць год засаб.

М. П. КАВАЛЕЎ.

КАЛІ НАМ ВЫПЛАЦЯЦЬ ЗАРПЛАТУ?

(ПІСЬМО РАБОЧАГА СОЎГАСА)

Рабочыя соўгаса **«Труды», Полацкага раёна**, яшчэ за красавік месяц не атрымалі зарплату.

На запытанне рабочых у дырэкцыі кожны раз адказваюць «выплацім, калі будуць грошы». А калі грошы будуць—нікому невядома.

ДРАЗДОЎ А.

САКРАТАРУ ЖЛОБІНСКАГА РК КП(б)Б Т. ПЛЕШАКОВУ

ВЫШЛА ПАКУЛЬ ШТО ГЛАДКА...

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКАЎ)

У калгасе імя 12-ай **гадавіны** Окцябра, Новамаркаўскага сельсовета, Жлобінскага раёна, ёсць цэлы рад злачынстваў.

Камплектаванне свінагадоўчай і малочна-таварнай ферм ідзе вельмі марудна. З прычыны дрэннага догляду і адсутнасці працоўнай дысцыпліны, на фермах вялікі адыход. З вясны 1933 года да вясны 1934 года загінула 285 парасят, або 60 проц. агульнага прыплоду. Загінула і 5 штук цялят.

Сарвана злучная кампанія па той прычыне, што вытворнікі ўвесь час скарыстоўваюцца для раз'ездаў. Абартаванне кабыл у калгасе — масавае з'явішча.

Сёлкі калгаса раскідаюцца направа і налева. Старшыня калгаса тав. **Гарадзецкі** «пазычыў» сабе 581 руб., свайму сябру па бутылцы Сяргеенку Трыфану — 190 рублёў.

Работай калгаса Гарадзецкі зусім не цікавіцца і не кіруе. У рэзультаце разгільдзяйства і недысцыплінаванасць пануюць ва ўсіх галінах гаспадаркі.

25 студзеня 1934 года рэвізійная камісія правяла рэвізію, але... рэвізійны акт і да гэтага дня ляжыць у папцы без рэагавання. За гэту паслугу рэвізійнай камісіі Гарадзецкі падкінуў сёе-тое з калгасных сродкаў старшыні рэвізійнай камісіі **Бордаку**. Вышла пакуль што гладка.

А. УСАЎ, Я. ТУЗАЎ.

НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТАДДЗЕЛА АРШАНСКАГА ЧЫГУНАЧНАГА РАЁНА ТАВ. КІРЫЛАВУ

НА ТРАНСПАРЦЕ ПРАЦУЕ ПАЛІЦЭЙСКІ

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

На XVII з'ездзе нашай партыі т.т. **Сталін і Варашылаў** з усёй рашучасцю ўказалі на недапушчальныя недахопы, якія ёсць на транспарце, і намецілі цэлы рад канкрэтных мерапрыемстваў для ліквідацыі гэтых недахопаў.

Для таго, каб правесці ў жыццё ўказанні правадыроў, у першую чаргу неабходна выгнаць класавапрыгодныя контрраволюцыйныя элементы, якія з-за палітычнай блізарукасці асобных кіраўнікоў чыгункі прымазаліся на транспарце.

На ст. Менск МББ чыгункі на працягу двух гадоў працуе былы паліцэйскі Абрамчык, жыхар ст. Койданава. Няхай Абрамчык расскажа свайму начальству, колькі нагаек улажыў у спіны рабочых і сялян у часе сваёй службы паліцэйскім стражнікам у Койданаве.

Паліцэйскім Абрамчык працаваў да 1917 года. У часе белапольскай акупацыі ў м. Койданаве ён аказаўся верным служкай белапалякаў.

На транспарце такіх Абрамчыкаў нямала. Іх неабходна зараз-жа выгнаць. Паліталддзел чыгункі павінен заняцца гэтым пытаннем зараз-жа.

І. М. ЕВЯЛЕЎСКІ.

„ЗВОДКІ І САПРАЎДНАСЦЬ“

Віцебскі гарком КП(б)Б і паліталддзел МТС абмеркавалі артыкул «ЗВОДКІ І САПРАЎДНАСЦЬ», змешчаны ў «ЗВЯЗДЗЕ».

Гарком і паліталддзел адзначылі, што надалей ў артыкуле факты дрэннай арганізацыі працы ў калгасах Віцебскага і Старасельскага сельсоветаў, факты ігнараванні работы сярод аднаасобнікаў (Старасельскі сельсавет), дрэнная якасці праполкі, прадстаўлення сельсоветамі ашуканчых зводак аб ходзе праполкі, калі ў зводкі ўключаліся дрэнна прапалатыя пасевы,—поўнасцю адпавядаюць сапраўднасці.

Партгрупе горсовета даручана ў пяцідзённы тэрмін забяспечыць у горземаддзеле выразную і аператыўную пастаноўку ўліку і справаздачнасці, умацаваўшы апарат кваліфікаванымі работнікамі. Горземаддзелу прапанавана праверыць ва ўсіх калгасах правільнасць запісаў працадзён у працоўныя книжкі калгаснікаў. Старшыня Старасельскага сельсовета тав. Бель і ўсе старшыні сельсветаў, пазнаёмленыя, што за малейшае ігнараванне аднаасобнікаў яны будуць прыцягвацца да адказнасці.

На чарговым пасяджэнні бюро ГК КП(б)Б будуць заслуханы паведамленні двух-трох сельсветаў аб рабоце сярод аднаасобнікаў.

Артыкул «Звязды» і пастанова ГК і паліталддзела распрацоўваюцца на пасяджэннях прэзідыумаў сельсветаў і ў калгасах, пры удзеле актыва калгаснікаў і аднаасобнікаў.

ЗА СЦЯГ „ПРАВДЫ“

(ДА ВЫНІКАЎ УСЕБЕЛАРУСКАГА РЭЙДА ПРАВЕРКІ СПАБОРНІЦТВАЎ СТАНЦЫЙ)

Арганізаці вузлы на асноўных паказальніках ідзе ў перадавых радах па МББ чыгунцы. Адная калі брыгады рэйда ўзялі за праверку работы кожнага ўчастка паасобку, то недаходнай аказалася многа. Новы начальнік станцыі Орша-Заходняя Дрозд па прыкладу свайго папярэдніка Мігунова даверыў справу праверкі... загадчыку камерцыйнага абмеркавання пункта Ягорову. Нядарма нагрузку плававала клієнтура, а не станцыя. Наперакор прамому ўказанню партыі і урада аб непасрэдным кіраўніцтве нагрузкай начальнікам станцыі, Мігуноў і Дрозд ухіліліся ад гэтага.

Вялікія недахопы былі выкрыты ў рабоце профарганізацыі. Яны не ўзначалілі социялістычнага спаборніцтва. Нават грамадская праверкі выканання социялістычных абавязацельстваў не забяспечылі. Ход і становішча спаборніцтва вызначаў у асноўным учотчык. Як на справе адбываецца спаборніцтва брыгад, змен і асобных рабочых — прафарганізацыі не ведаюць. Нядарма ў ліку ўдарнікаў аказаліся разгільдяі і парушальнікі працоўнай дысцыпліны: **Лісіца, Шамшураў, Бетраснёў, Кошалёў, Плевакес, Анкінові** і інш. (Орша-Заходняя), **Кісяпёў, Маскалёў** (Орша-Усходняя) і т. д.

Не арганізавана перадача вопыту лепшых ударнікаў **Сляжнёва, Гумінскага, Бельскага, Каршунова, Прусава, Хадатовіча** і інш. Толькі ў часе рэйда па ініцыятыве рэйдавых брыгад пачалі праводзіцца сходы на абмену вопытам.

На ст. Орша-Заходняя брыгада выкрыла прамыя злоўжыванні работнікаў МК. Мясцком ніякай масава-палітычнай работы не праводзіў. Адна трэць калектыва работнікаў станцыі не плаціла членскіх узносаў.

Следам за апублікаваннем тэзіса матэрыяла старшыня МК **Кавалёна** быў знят з работы і аддан пад суд. Увесь склад МК перавыбран.

Рад буйных недахопаў быў і ў рабоце мясцкома ст. Орша-Цэнтральная. Мясцком (старшыня **Ніяіцюк**) зусім мала займаўся пытаннямі культурна-бытавога абслугоўвання рабочых. У бараку № 14 неймаверны бруд, цеснота, ў пакоях няма фортак. Не вялося ніякай культурнай работы ў бараку, нават газет тут не відаць было. Прыкладна такое-ж становішча і ў сталоўцы № 19. Тав. Нікіцюк нават не лічыў сваім доўгам хоць раз зайсці туды. Чырвоны куток пры мясцкоме зусім бяздзейнічаў. Памяшканне Чырвонага кутка ўтрымлівалася ў выключна брыдкім выглядзе — ніякай мэблі, ні бібліятэчкі, ні газет.

Што-ж канкрэтна зроблена ў часе рэйда для знішчэння ўсіх гэтых недахопаў? У бараку № 14 пачаўся рамонт, чырвоны куток пабелен, убран, заведзены дошкі спаборніцтва змен, паявіліся газеты. Але няма яшчэ ніякага зруху ў сталоўцы.

Райпрафсож (нам. старшыні **Глуханаў**), ведаючы і бачачы бяздзейнасць сваіх ніізавых профаведняў, устаецца ў ролі пабочнага назіральніка.

Сур'ёзную ўвагу звярнулі брыгады на слабую барацьбу станцыі за маршрутызацыю і спецыялізацыю паяздоў. Яны выявілі, што ў гэтым вінаваты не толькі дыспетчары станцыі (Куневіч і інш.), але і дыспетчары аддзялення службы эксплаатацыі — **Раманаў і іншыя.**

Першая палова чэрвеня ў гэтай рабоце дала вынікі вдуш. Пасля зальніка маршрутызацыі і спецыялізацыі значна палепшыліся, перавысілі ўстаноўленую норму.

Некалькі слоў аб дыспетчарскай нарадзе амен. Яны не даюць пазітыўнага эфекту. Зараз дыспетчарскія нарады на ст. Орша-Цэнтральная і на ст. Орша-Заходняя (на ст Орша-Усходняя чамусці наогул рашылі, што праводзіць дыспетчарскія нарады — гэта лішняя справа) аводзяцца да абгаварання розных пытанняў, зусім не звязаных з выкананнем сутачнага плана. Між тым задача дыспетчарскай нарады заключаецца іменна ў тым, каб дэталёва абгаварыць сутачны план, абгаварыць, як лепш яго выканаць, а пасля заканчэння дзяжурства аноў сабрацца пяцігвілінную нараду і тут-жа падвесці вынікі, мабілізаваць змены на асобных фактах як добрай, так і дрэннай работы. Гэтага, на жаль, да апошняга часу не было.

Вялікую ўвагу звярнулі брыгады на абслугоўванне пасажыраў работнікамі вакзала (начальнік вакзала Літвінаў). Аказалася, што не ўсё добра. На перонах і ў вакзале не было нават бака з вадой. У буфетах недахоп прахладжальных напіткаў, вакол вакзала бруд, антысанітарыя, смецце тыднямі не ўбіраецца, у медпункце няма нават такіх простых медыкаментаў, як ёд, вата, бінт і інш. Ля білетных кас, не агароджаных бар'ерамі, заўсёды штурханіна. Каса прыгарадных паяздоў пабудавана так, што пасажыру прыходзіцца атрымліваць білет з вуліцы. Зрабіць навес ніхто не дадумаўся. На скаргі пасажыраў начальнік вакзала не рэагуе. У кнізе скаргаў даюцца чыноўніцкія адказы аб тым, што скарга перадана начальніку станцыі і т. д. Што-ж зрабіў начальнік станцыі — астаецца сакрэтам. Або яшчэ такія адказы. Скардзіцца пасажыр, што яго- аш трафавалі за тое, што ён, быццам, заснуў на вакзале. Па сканчэнню прыкладна, тыдня, калі пасажыр даўно забыў аб вакзальных чыноўніках, у кнізе скарг паяўляецца адказ Літвінава, што пасажыра аштрафавалі не за сон, а за тое, што... пляваў на падлогу.

Або такі факт. Піша скаргу пасажыр на дзяжурнага справачнага бюро. Няправільную даведку далі яму аб прыходзе маскоўскага поезда; з-за гэтага ён патраціў многа лішняга часу. Як-жа рэагаваў Літвінаў? Ён зноў, прыблізна праз тыдзень, запісвае ў кнігу, што вінаваты не дзяжурны, а той, хто напісаў скаргу, бо ён пытаў не пра маскоўскі поезд, а пра поезд Манчжурыя-Негарэлае. Вось гэта сапраўды вынаходніцтва. Пасажыр, бачыце, не ведае, які яму поезд патрэбен, а Літвінаў ведае.

Праверка партыйна-масавай работы выявіла велізарныя недахопы. На ст. Орша-Цэнтральная парторг т. **Конч** не займаўся з шасцю спачуваючымі, якія на працягу 8-мі месяцаў не наведвалі партсходаў. Выкананне партыйных даручэнняў членамі партыі ён не правярае. Не ведае і пра ўчынкі, зробленыя членамі партыі. Член партыі Пархоменка, напрыклад, за затрымку поезда атрымаў па адміністратыўнай лініі вымову, а парторг Конч аб гэтым даведаўся толькі ад брыгады рэйда.

Партучоба ў групе сістэматычна зрываецца. Адна серыя ў парторгрупе ст. Орша-Заходняя. Парторг Стульба нават не мог адказаць, што з членам партыі ахоплен соцспаборніцтвам. Рад комуністаў не паказваюць прыкладу на вытрымцасці. З шасці комуністаў у групе два мазнік дысцыплінарныя спагнанні. Падзвычай слаба партыйна-масавая работа на ст. Орша-Усходняя (сакратар парткома **Фролкін**).

Рэйд значна ажывіў работу нізавога друку. Праверка паказала, што парторганізацыя і чыгуначная газета «Большэвіцкі сігнал» зусім не дапамагалі і не кіравалі насценгазетамі і рабкорамі. Вось чаму большасць газет выходзіла нерэгулярна. Усе заметкі падпісваліся псеўданімамі. Крытыка была абязлічана. Рэагаванне на заметкі выключна слабае.

У рэзультаце рэйда і пры дапамозе праведзеных нарад рэдкалегій значна ажывілася работа друку. Часцей пачалі выходзіць газеты. Сталі змяшчацца больш сур'ёзныя і канкрэтныя матэрыялы. Павялічыўся прыток рабкораўскіх заметак. Палепшылася і рэагаванне, хоць у гэтай справе патрэбнага пералому і да гэтага часу яшчэ няма.

Некалькі слоў аб шэфскай работе гарадскіх прадпрыемстваў. У пачатку рэйда ніякай шэфскай работы не было. Паслалі брыгады рабкораў - чыгуначнікаў пагутарыць, вытлумачыць, у чым прычыны гэтага. Адразу зашавяліліся, пачалі прыязджаць, знаёміцца з работай падшэфных. Але канкрэтнай дапамогі не было. Штаб рэйда паставіў пытанне перад РК КП(б)Б. Бюро райкома заслухала інфармацыі кіраўнікоў рада прадпрыемстваў, горсовета, райпрофсовета і наркамздзіла ў апошні раз аб неабходнасці ў бліжэйшыя дні выканаць узятыя на сябе абавязацельствы. К канцу рэйда былі ўжо першыя практычныя рэзультаты: пабудаван падязны шлях, адведзен будынак пад таварную кантору, абсталяван пакой маці і дзіцяці, радыёфікавана 8 кватэр рабочых-ударнікаў, адремонтавана пяць будак і т. д. Апрак, гэта толькі першыя крокі. Рад прадпрыемстваў (мясакамбінат, маслапром і інш.) яшчэ не прыступілі да практычнай дапамогі. Акрамя таго, у ратзе выпадкаў наглядзецца скажэнне пролетарскага шэфства — выхалашчванне палітычнага заместу шэфства. Матэрыяльная дапамога не ўвязваецца з палітычнай дапамогаю, з абменам вопытам і дапамогай культурнымі сіламі, прапагандыстамі і т. д.

Такавы першыя, далёка няпоўныя, вынікі рэйда, праведзенага «Звяздой», журналам «Большэвіцкі друк» і газетай «Большевистский путь». Рэйд даў вялікія рэзультаты. Задача зараз заключаецца ў тым, каб замацаваць уздым, які ёсць сярод рабкораў-ударнікаў, яшчэ больш ажывіць работу насценгазет, аказваючы ім практычную дапамогу і моцнае партыйнае кіраўніцтва. Асноўную ўвагу звярнуць зараз на неадкладную ліквідацыю выкрытых недахопаў і разгортванне далейшай барацьбы за ўзорную работу, за заваяванне сцяга ЦО партыі «Правды».

Р. ДОДЗІН.

КУЛАЦКАМУ АХВОСЦЮ НЕ МЕСЦА У КААПЕРАЦЫІ

(АГЛЯД ПІСЕМ, ПАСТУПІЎШЫХ У РЭДАКЦЫЮ)

Адной з асноўных умоў паспяховага разгортвання таваразвароту і совецкага культурнага гандлю з'яўляецца рашучае паляпшэнне кааператыўных кадраў.

Самацёк у падборы гандлёвых кадраў асабліва небяспечны — ён тармозіць барацьбу за совецкі гандаль, ён аблягчае злачынную дзейнасць класава-варожых элементаў.

Важнейшым рашаючым звяном разгортвання таваразвароту з'яўляецца **сельпо**. Старшыні сельпо, работнікі сельскіх крам — гэта сапраўдныя праваднікі совецкага гандлю на вёсцы. Іменна на іх ускладзена адказнейшая задача забяспечыць працоўнае насельніцтва вёскі таварамі шырокага спажывання.

Між тым, **падбор кааператыўных кадраў на вёсцы — самы занінуты ўчастак.** Тут асабліва алчуваецца самацёк і тут асабліва энергічна дзейнічаюць класава-варожыя элементы.

Досыць прыўесці некалькі характэрных прыкладаў, каб пераканацца ў гэтым.

Вось **Пухачоўскае** сельпо, Горацкага раёна. Старшынёй яго з'яўляецца нейкі Літвінаў. Жонка Літвінава Бярдешнікава загадвае маслазаводам пры сельпо. У мінулым годзе Літвінаў разам з жонкай раскралі 160 кілё масла. Таксама ў мінулым годзе Літвінаў адправіў на станцыю скрынкі, у якіх замест масла ляжала цэгла.

У гэтым годзе той-жа Літвінаў прыскіў сабе тавары, вызначаныя для стымулявання закупак хлеба. З сакавіка месяца марыпуе пракуратура спрагу аб злачынствах Літвінава. І гаўгны пракурор **Сідараў** яўна пратэжырыць злачынцу. Карыстаючыся апекай пракуратуры, Літвінаў растраціў нядаўна 560 р. кааператыўных грошай.

У краме **дзманавіцкага** сельпо (Мазыршчына) працуе былы кулак **Іваноў**. Гэты Іваноў праводзіць кулацкую палітыку ва ўсёй гандлёвай рабоце. Прайшла пасеўная, канчаецца праполка, а сельпо ніякага ўдзелу не прынялі ў гэтых важнейшых сельска-гаспадарчых работах, наадварот — тавары, вызначаныя для калгаснікаў (цукар, мануфактура пашіросы). Іваноў разбазарваў сярод сваякоў і знаёмых. Прыслалі цукар для ясляў калгаса «Культура». Цукар быў разбазаран і ні адно кіло не трапіла дзецям. Кудысці знікні 40 пачак папіросаў. Іваноў з апаратам сельпо трэба праверыць кадры работнікаў міжгаённых б-з Белкаадсаюза. Вось што робіцца, напрыклад, на **Слуцкай** кааператыўнай базе. Пад крыкам дыхоркі, вызначаных для ўдарнікаў-пастухоў калгасаў.

У спажывецкай сістэме **Ельскага** раёна акапаліся чужакі, якім не месца ў гандлёвай сетцы. Можна назваць некалькі імён. Старшынёй **махноўскага** сельпо працуе сын былога буйнога лесапрамыслоўца **Рагінскі**. Загатоўшчык **качышчанскага** сельпо спекулянт **Фурман** быў у свой час пазбаўлен выбарчых правоў. Намеснікам старшыні качышчанскага сельпо з'яўляецца былы буйны гандляр **Фурман**. Ён меў патэнт 4-га разраду. Старшыня Скараднянскага сельпо **Запцман** судзіўся за хабары. Рахункавод сельпо **Мазурэнка**—сын паліцэйскага. Гэта цёплая кампанія ва ўсю займалася самаснабжэннем, раскрадваннем прадуктаў і менш за ўсё клапацілася аб снабжэнні калгаснікаў і аднаасобнікаў.

Трэба пазнаёміцца і з работнікамі **тапачынскага** местачковага спажывецкага таварыства. Загадчыкам магазіна гэтага таварыства працуе пішонец **Сушкін**. Ён нядаўна зняў з работы работніцу прылаўка **т. Данаву**, якая выкрыла рад агіднасцей, тварыўшыхся ў краме. Намеснікам старшыні сельпо працуе сын былога скупшчыка збожжа і лесапрамыслоўца, нейкі **Рахпін**, загадчыкам сталовай — пазбаўлены правоў **Ліўшыц**.

Група спекулянтаў сабралася і ў крамах **Рэчыцкага** райсаюза. Загадчык крамы № 1 **Казман**—былы спекулянт і № 2 — Бардо, таксама «былы», займаліся ўвесь час разбазарваннем, раскрадваннем дэфіцытных тавараў, вызначаных на **загатоўкі** яек, на закупку хлеба.

Чым тлумачыць такія факты? Толькі тым, што **раённыя партыйныя арганізацыі зусім не цікавіліся падборам кадраў** нізавых гандлёвых работнікаў, не зразумелі, што гэта пытанне рашае поспех таваразвароту. Карыстаючыся прытуплення класавай пільнасці мясцовых арганізацый, растратчыкі, зладзеі, самаснабжэнцы пралезлі ў гандлёвую сетку і там спакойна тварылі сваю брудную справу.

Трэба правяраць кадры работнікаў міжгаённых б-з Белкаадсаюза. Вось што робіцца, напрыклад, на **Слуцкай** кааператыўнай базе. Пад крыкам дырэктара базы **Чумака** на прадпрыемстве звілі сабе гняздо спекулянты і самаснабжэнцы. Намеснік дырэктара базы **Міньковіч** да паступлення сюды працаваў у Любаньскім райсаюзе, быў зволен і асуджан на тры гады за самаснабжэнне і растрату. Нядаўна ён звольніў загадчыка мануфактурнага склада **Шэпега** за тое, што апошні не выканаў распараджэння аб водпуску яму, Міньковічу, са склада пары жаночых **туфель** і шэрсці на сукенку.

Новы загадчык склада **Швейдэль** раней загадваў складам Старобінскага райсаюза, быў зволен адтуль за самаснабжэнне і вычышчан з совецкага апарата. Гэта «пара» скарыстала для сваіх патраб 6 штук чорных аўчын, прысланых для стымулявання збожжазакупак, і пашыла з іх сабе казакіны. На рэкамендацыі т. Міньковіча кантралёрам базы працуе нейкі Рапапорт, які быў зволен з работы ў любаньскім райсаюзе за самаснабжэнне. Адным словам, на базе сабралася хэўра жулікаў, якія знайшлі сабе там «даходнае месца».

Указаныя факты яшчэ раз сведчаць, што наяўныя кадры многіх райсаюзаў і сельпо не забяспечваюць выканання адказнейшых задач, пастаўленых партыяй перад совецкім гандлем.

Таму задача выхавання і вылучэння новых кадраў кааператыўных работнікаў набывае актуальнейшае значэнне.

Яна пастаўлена зараз, як важнейшая задача раённ

ЗА РУБЯЖОМ

У ФАШЫСЦКІМ ЛАГЕРЫ БАРАЦЬБА АБВАСТРАЕЦЦА

ВОЙСКІ І ПАЛІЦЫЯ ЗАХАПІЛІ ПАМЯШКАННІ ШТУРМАВЫХ АТРАДАЎ

ВЕНА, 30 чэрвеня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Берліна, ва ўсіх гарадах Германіі паліцыя, часці рэйхсвера і ахранныя атрады занялі памяшканні штурмавых атрадаў. Кватэра начальніка штурмавых атрадаў Рэма ў Мюнхене занята паліцыяй. «Карычневы дом» у Мюнхене ацэплен ваеннымі атрадамі і часцямі рэйхсвера.

Як паведамляюць, прычынай выступлення супроць штурмавікоў паслужыла іх рашэнне ўзброіць сілай супраціўляцца роспуску атрадаў, а таксама праведзеная імі 30 чэрвеня раніцой трывога на прадпрыемствах.

ЗАБОЙСТВЫ КІРАЎНІКОЎ ШТУРМАВЫХ АТРАДАЎ

БЕРЛІН, 1 ліпеня. (БЕЛТА). Як паведамляе інфармацыйнае бюро, у часе падзей 30 чэрвеня забіты кіраўнік брыгады штурмавікоў у Мюнхене, тры акруговых кіраўнікі і тры абласных, у тым ліку вядомы па працэсу аб падпале рэйхстага абласны кіраўнік штурмавікоў Сілезіі Гейнес.

***

БЕРЛІН, 1 ліпеня. (БЕЛТА). Паведамляюць, што Грэгор Штрасэр, які, пібыта, быў звязваючым звяном паміж Шлейхерам і Рэмам, забіт. Афіцыяльных вестак няма. 30 чэрвеня вечарам Гітлер прыбыў у Берлін.

Як паведамляе друк, Гебельс 29 чэрвеня быў выклікан Гітлерам у Гедэсберг і з таго часу быў неадлучна пры ім.

ШТУРМАВІКІ РЫХТАВАЛІСЯ ДА УЗБРОЕННАГА ВЫСТУПЛЕННЯ СУПРОЦЬ УРАДА

БЕРЛІН, 1 ліпеня. (БЕЛТА). 30 чэрвеня вечарам у гутарцы, данай прадстаўнікам германскага друку, Герынг зрабіў рад заяў, якія недвузначна гавораць аб тым, што штурмавыя атрады рыхтаваліся да ўзброенага выступлення супроць урада. Герынг заявіў:

«Верных членаў штурмавых атрадаў ашукалі. Іх прывялі ў стан баявой гатоўнасці і ўзброілі, але яны не ведалі для чаго. Тыя, хто прадаўжаў гаварыць аб другой рэвалюцыі, панясуць цяжкую кару. Мы не пацерпім, каб прадаўжаліся разгаворы аб другой рэвалюцыі. Мы нанеслі ўдар мяцежнікам, удар зусім нездаволеным колам рэакцыі. Мы вызвалім штурмавыя атрады ад усіх тых элементаў, якія толькі цяпер прышлі ў штурмавыя атрады і якія там займалі камандныя пасты. Мы зробім так, каб у пашане зноў аказаўся старык-штурмавік».

Разгаворы аб «рэакцыі» і аб «пашане для старых штурмавікоў» прадстаўляюць сабой спробу згладзіць уражанне, створанае сярод штурмавых атрадаў расправай урада над віднейшымі кіраўнікамі штурмавікоў.

РЭМ ПАКОНЧЫЎ САМАГУБСТВАМ

ЛОНДАН, 1 ліпеня. (БЕЛТА). Паводле апошніх паведамленняў, Рэм пакончыў самагубствам.

***

БЕРЛІН, 1 ліпеня. (БЕЛТА). Весткі аб самагубстве Рэма, як відаць, пацвярджаюцца, хоць 30 чэрвеня вечарам міністэрства прапаганды паведаміла ўсім замежным журналістам, што Рэм «толькі арыштаван».

ГІТЛЕР ПАТРАБУЕ ПАДНАЧАЛЕННЯ

БЕРЛІН, 1 ліпеня. (БЕЛТА). Гітлер у загадзе новаму начальніку штаба штурмавых атрадаў Лютце, прадпісвае «весці барацьбу супроць разлажэння» і супроць растраты кіраўнікамі штурмавых атрадаў грамадскіх сродкаў. Гітлер заяўляе, што патрабуе ад кіраўнікоў штурмавых атрадаў «поўнага падначалення і безумоўнай дысцыпліны». Гітлер прадпісвае кіраўнікам штурмавікоў «прымяняць свае меры ў той галіне, якая ім падначалена, а не ў той, якая адносіцца да кампетэнцыі другіх».

Выдан загад, які рэзка абмяжоўвае функцыі і кампетэнцыю кіраўнікоў штурмавікоў, аднімаючы ў іх былое іх значэнне.

Гітлер патрабуе таксама ад кіраўнікоў штурмавікоў «лаяльнага падначалення і вернасці рэйхсверу».

БЕРЛІН, 1 ліпеня. (БЕЛТА). Назначаны начальнікам штаба штурмавых атрадаў Лютце быў да вайны паштовым чыноўнікам у Вестфаліі, пасля вайны гандляром і затым уступіў у штурмавыя атрады.

ЦІ БУДЗЕ БРАУН ПРЫЦЯГНУТЫ ДА АДКАЗНАСЦІ

Суд адтэрмінаваў разгляд справы

ГЕЛЬСІНГФОРС, 1 ліпеня. (БЕЛТА). 30 чэрвеня суд па справе Брауна, які зрабіў замах на супрацоўнікаў паўпрэдства СССР у Гельсінгфорсе, патрабаваў ад прысутных у зале ў якасці сведак кур'ераў паўпрэдства Баговіча і Марціновіча адказу, ці жадаюць яны выступіць у якасці... істцоў па справе Брауна. Абодва адказалі адмоўна, заявіўшы, што справа ідзе не аб асабістыхісках, а аб замаху на дыпламатычную савецкую місію.

Асаблівую ўвагу суд аддаў пытанню аб якасці рэвальвера, з якога страляў Браун у супрацоўнікаў паўпрэдства.

Абаронца Брауна Такканен хадайнічаў адкласці слуханне справы, матывуючы стомленасцю абвінавачанага. За адтэрмінаванне працэса выказаўся таксама абвінаваўца, матывуючы тым, што паўпрэдства да гэтага часу не выступіла з прэтэнзіямі па данай справе. Абаронца патрэбаваў вызвалення Брауна з турмы на той падставе, што рэвальвер, з якога Браун страляў, нібыта недасканалы. З прычыны гэтага, на думку абаронцы, Браун павінен быць прыцягнут да адказнасці толькі за недазволенае хаванне зброі. Суд пастанавіў адтэрмінаваць разгляд справы да 14 ліпеня, пакінуўшы Брауна ў турме.

Па Совецкай Беларусі

ЗЛЁТ ПІОНЕРАЎ—ДАЗОРНЫХ ПА АХОВЕ УРАДЖАЮ

БАРЫСАЎ, 1 ліпеня. (БЕЛТА). Адбыўся першы раённы злёт піонераў—дазорных па ахове ўраджаю. На злёце прысутнічала больш 200 піонераў горада і сельсоветаў.

Лепшыя дазорныя т.т. **Бурдыка, Кручок, Няварка** і інш. расказалі злёту, як у іх арганізавана ахова ўраджаю, барацьба з кулацкімі «парыкмахерамі», шэфства над маладняком. Злёт прыняў выклік піонераў Аршаншчыны на лепшую работу піонерскіх дазорных ураджаю і дапамогі калгасам ва ўборцы.

ДАПАМОГА ПАДШЭФНАМУ БІРА-БІДЖАНУ

Наркамасветы БССР распрацаваў план канкрэтных мерапрыемстваў па аказанню падшэфнай яўрэйскай Біра-Біджанскай вобласці дапамогі ў падрыхтоўцы да новага навучальнага года. На пастаянную работу ў школы вобласці накіроўваюцца 19 яўрэйскіх настаўнікаў і 3 тэатральныя работнікі. Выдзяляецца 40 школьных бібліятэк, 5 ціскоў, 26 варштатаў па металу і дрэву, 3 наборы інструментаў па дрэву, алоўкі, пер'і, 20.000 сшыткаў.

На другое паўгоддзе для яўрэйскіх настаўнікаў будзе выпісана 100 экз. газет «Окцябр», «Штэрн», «Юнгер арбейтэр».

Наркамат аховы здароўя адправіў Біра-Біджанскаму курорту Кульдур абсталяванне для вубалячэбнага і фізіятрычнага кабінетаў. Туды-ж выехала 7 медыцынскіх работнікаў. Пачата вярбоўка яшчэ пяці дактароў і 10-ці сёстраў і лекпомаў.

ВЫПУСК ФІЗІКАЎ І МАТЭМАТЫКАЎ

29 чэрвеня ў летнім тэатры сада «Профінтэрн» адбыўся сход студэнцтва і выкладчыкаў Белдзяржуніверсітэта, прысвечаны вынікам навучальнага года. Прысутнічала каля 1.500 чалавек.

На вечары адбыўся ўрачысты выпуск фізіка-матэматычнага факультэта. Скончыла 41 чалавек. Большасць з іх з поспехам абараніла дыпломныя работы. Усе выпускнікі ўжо размеркаваны Наркамасветы па раёнах Беларусі.

Праўленнем Белдзяржуніверсітэта выпускнікі-ўдарнікі прэміраваны экскурсіяй на Днепрадэс, Рыондэс і іншыя новабудоўлі. Прэміраваны таксама 10 лепшых студэнтаў іншых факультэтаў універсітэта.

ТАКСІ Ў МЕНСКУ

Па Менску пачалі курсіраваць 5 таксі. Устаноўлены стаянкі ля пасажырскага вакзала, на плошчы каля гасцініцы «Еўропа» і ля Парка культуры і адпачынку. Тарыф — 80 кап. за кілометр з аднаго пасажыра, больш аднаго пасажыра — 1 руб., за межы горада — 1 р. 30 к. за кілометр. Пры перавозцы багажа да 2-х пудоў на аднаго пасажыра 1 руб. кілометр.

Гэтымі днямі чакаецца атрымане 5-ці новых аўтабусаў, якія будуць працаваць на лініях, дзе няма трамвайных зносін.

МЕДЫЧНЫ ТЫДЗЕНЬ У ГОМЕЛІ

Наркамат аховы здароўя БССР, інстытут удасканалення дактароў і гомельская інспекцыя аховы здароўя арганізоўваюць з 5 па 11 ліпеня медычны тыдзень у Гомелі.

На працягу тыдня будзе працытана 14 дакладаў аб навейшых дасягненнях совецкай медыцыны і работах інстытутаў і клінік. Для гэтай мэты ў Гомель выедуць нарком аховы здароўя тав. СУРТА, акадэмік ГАЎСМАН, прафесары МЕЛКІХ, ЛЕНЦ, МАРКАЎ, ЦІТОЎ, ХАЗАНАЎ ГІНЗБУРГ, САКАЛОЎСКІ і інш.

На тыдзень выклікаюцца ў Гомель раённыя дактары з 15 бліжэйшых раёнаў, а таксама медработнікі чыгуначнага і воднага транспарта.

ЧАЙНАЯ І ЛАРОК ПРЫ КОЖНЫМ ПРЫЕМАЧНЫМ ПУНКЦЕ

Белкаапсаюз прапанаваў старшыням райсаюзаў неадкладна прыступіць да арганізацыі на прыёмачных пунктах ларкоў і чайных, каб к пачатку паставак сустрэць здатчыкаў культурным абслугоўваннем. Для ларкоў і чайных з цэнтралізаваных фондаў будзе адпушчана на 50 тысяч рублёў махоркі, на 250 тысяч папярос і 30 тон кандзіцерскіх вырабаў. БАКТ'ам пры культчайных будуць арганізаваны ларкі для продажу літаратуры і культтавараў.

(БЕЛТА)

ПРЭМІРАВАНА 33 ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ФІНФРОНТА

Наркамфін, ЦСПСБ і цэнтральная камісія садзейнасці дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры прэзідыуме ЦВК БССР пастанавіла прэміраваць 33 лепшых ударнікаў фінфронта за ўзорную работу, праведзеную імі па рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі выпуску другога года. Сярод прэміраваных — начальнік палітаддзела Магілеўскай МТС тав. **ЛЕВІН** і начальнік палітаддзела Бегрынскай МТС тав. **ПЛОТКІН**. Па Віцебскаму раёну прэміраваны ўдарнікі фінфронта фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», імя Клары Цэткін і інш. Усяго выдзелена прэмій больш як на 3.000 руб. Большая палова прэміраваных ударнікаў фінфронта атрымалі граматы НКФ.

(БЕЛТА).

ФОТО РАСКІНА

ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПРАКЛАДКА НОВАЙ ТРАМВАЙНАЙ ЛІНІІ ПА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ ВУЛІЦЫ.

ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ У МЕНСКУ

На апошнім пасяджэнні праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР з удзелам прадстаўнікоў бібліяграфічнага інстытута, бібліятэкі імя Леніна і інстытута літаратуры і мастацтва Беларускай акадэміі навук прызнана неабходным арганізаваць у Менску літаратурны музей. Для яго адводзяцца спецыяльныя пакоі ў будынку дзяржаўнай бібліятэкі.

У музеі будуць сканцэнтраваны ўсе дакументы, характарызуючыя літаратурны рух у БССР, дакументы звязаныя з творчасцю паасобных пісьменнікаў і іх прадукцыі. Намечана арганізацыя нацыянальных аддзелаў: яўрэйскага, польскага, літоўскага.

Музей будзе з'яўляцца навукова-даследчым і вопытна-вучэбным пунктам для навуковых работнікаў, пісьменнікаў і выкладчыкаў літаратуры. Адкрыццё музея намячаецца 1 студзеня 1935 года.

НА СТАДЫЕНЕ „ДЫНАМО"

* Гэтымі днямі на менскім стадыёне «Дынама» адбылася футбольная сустрэча паміж зборнай камандай працоўных комун АДПУ (Масква) і менскай камандай «Дынама». Спаборніцтвы закончыліся вынікам 2:1 у карысць дынамаўцаў.

* 6 ліпеня паладжваецца сустрэча па футболу паміж камандай Масквы, атрымаўшай пяршынства па маскоўскаму футбольнаму розыгрышу, і камандай «Дынама» (Менск).

* 12 ліпеня на стадыёне адбудзецца першае ўсебеларускае дынамаўскае дзіцячае свята, у якім прыму муць удзел 150 дзяцей.

* Гэтымі днямі ў Доме мастака адкрываецца выстаўка работ маладога совецкага мастака **Красоўскага**. Будзе выстаўлена каля 100 яго карцін.

* Па Ленінскай вуліцы адкрываецца першы ў Беларусі дзіцячы ўнівермаг, які будзе складацца з 8 аддзелаў: піонерска-спартыўнага, мэблі, абутку і інш. Горрабкоп камандзіраваў у Маскву спецыяльнага работніка для адбору тавараў.

* На тэрыторыі Універсітэцкага гарадка пачата разбіўка новага сквера з кветнікамі, газонамі і т. д.

* Для ўдзелу ў святкаванні 14-годдзя вызвалення БССР ад белапалякаў у Менск будуць запрошаны дэлегацыя Смаленска і прадстаўнікі з Віцебска і Гомеля.

* У Менску закончылася ўсебеларуская нарада дактароў па пытаннях **барацьбы з трахомай**. На нарадзе было абгаворана пытанне аб рэалізацыі плана Наркамата аховы здароўя па барацьбе з трахомай і заслуханы даклады з месц.

* Кіраўніцтвам Наркамсувязі БССР узнята пытанне аб пашырэнні АТС да 10.000 абанентаў. У цяперашні момант у сетку АТС уключана каля 4.000 абанентаў.

ХУТКАЯ ДАПАМОГА НА САМАЛЁТАХ

ЦК таварыства Чырвонага крыжа БССР атрымаў 2 малых санітарных самалёта тыпу «У-2». Прыступлена да арганізацыі хуткай дапамогі на самалётах.

АДКРЫВАЕЦЦА ЦЫРК

5 ліпеня ў гарадскім садзе адкрываецца цырк. У праграме — лепшыя нумары выдатных замежных і совецкіх артыстаў.

Цырк перааабсталёван і ўмяшчае 2.500 чалавек. У выходныя дні будуць арганізоўвацца ранішнікі для дзяцей.

Дырэкцыя цырка наладзіць выезды артыстаў на прадпрыемствы для паказаў у часе абедзенных перапынкаў.

БОЛЬШ АДКАЗНАСЦІ І ДЫСЦЫПЛІНЫ

Учора не адбыліся два сур'ёзных сходы: грамадскі суд над багерам (тарфяная машына), які павінен быў адбыцца ў клубе імя Сталіна. Дырэктар завода імя Варашылава **Шаўкоў** і сакратар парткома **Дзяч** спазніліся на сход на 2 гадзіны 30 мін. Старшыня ЦП металістаў наогул не з'явіўся.

Не адбылася таксама гарадская канферэнцыя рабочых спажыўцоў швэйнай і абутковай прамысловасці. Канферэнцыя, па-першае, сарвалася таму, што большасць сакратароў парткомаў не знайшлі часу для яе падрыхтоўкі, і таму з'явілася вельмі мала прадстаўнікоў (150 чал.); па-другое, таму, што не з'явіліся кіраўнікі трэстаў і наркамата лёгкай прамысловасці.

Урок зрыву гэтых сходаў сведчыць аб тым, што не ўсё добра ў галіне дысцыпліны і адказнасці адказных гаспадарчых, прафесіянальных і партыйных работнікаў.

ЗА 1.500.000 ТОН ВЫСОКАЯКАСНАГА ТОРФУ!

ХОД ТОРФАЗДАБЫЧЫ НА 28 ЧЭРВЕНЯ

УСЯГО ЗАВОДАМІ БЕЛТОРФА З ПАЧАТКУ СЕЗОНА ЗДАБЫТА

Машынафармовачнага	Фрэзернага	Рэзнага
130.804 тоны або 53,6 проц. к плану сезона	45.486 тон або 49,9 проц. к плану сезона	6.978 тон або 103 проц. к плану сезона

ТОРФАПРАДПРЫЕМСТВЫ	проц. выканання сезонага плана	проц. выканання ка ляндарнага плана
Асінторф	52,5	87
«Чырвоны сцяг»	50,8	84,1
Смалявічы	53,9	102,3
Даўмана	89,9	116,1
«Свабода»	50,9	79,5
Дукора	46,4	89,8
Лукская	54,5	100,5
РАЗАМ	51,2	89,6

ЗА 28 ЧЭРВЕНЯ заводамі Белторфа здабыта торфу: машынафармовачнага 2760 тон — 103 проц. задання, фрэзернага — 2.736 тон і рэзнога — 105 тон. Разам — 5.837 тон — 137,7 проц. дзённага задання.

МАСКОЎСКІ ТЭАТР РЭВОЛЮЦЫІ

„ЧЕЛОВЕК С ПОРТФЕЛЕМ"

У пастаноўцы «Человек с портфелем» тэатр (пастаноўка 1927-28 года) знайшоў праблемную п'есу, якая адыграла велізарнейшую ролю ў жыцці ўсёй совецкай драматургіі. Сведам за ёю нашы тэатры паказалі цэлы рад п'ес, трактуючых ролю інтэлігенцыі ў рэвалюцыі і ролю шкодніцкаў у нашым жыцці. А. Фалько здолеў у гэтай п'есе паказаць шкодніцкія настроі, надзеі на зварот мінулага, на інтэрвенцыю і рэстаўрацыю сярод асобных слаёў інтэлігенцыі.

Значэнне пастаноўкі гэтай п'есы выходзіла далёка за межы чыстай тэатральнай з'явы. Безумоўна, было няправільна, калі некаторыя крытыкі гаварылі, што «Человек с портфелем» ёсць паклёп на інтэлігенцыю. Шахцінскі працэс, працэс Рамзіна, меншавікоў, справа контррэвалюцыйных беларускіх нацыянал-дэмакратаў паказалі, што тэатр з вышыні сваёй сцэны своечасова сігналізаваў аб наяўнасці такіх элементаў сярод часткі неразброёўшайся інтэлігенцыі.

Што мы маем у п'есе?

Прафесар Гранатаў — ідэалатічна чужы нам да мазга касцей—прабуе прыстасавацца да сацыялістычнага будаўніцтва. Ён усвойвае совецкую фразеалогію, імкнецца паказаць сябе не толькі прыхільнікам совецкай улады, але і гатоў змагацца і садзейнічаць росту сацыялістычнага будаўніцтва. Але ў сапраўднасці ён бяздушны фармаліст, эгаіст, які імкнецца ставіць сваё ўласнае «я» вышэй усяго. Для дасягнення сваіх эгаістычных мэт Гранатаў не спыняецца перад злачынствам: сваімі бяздушнымі паводзінамі ён даводзіць да самагубства сваю жонку — эмігрантку Ксенію Траверн, старога прыяцеля сваіх бацькоў, чэснага совецкага патрыёта—прафесара Андросава. Вымушаны крывадушнічаць перад маладымі аспірантамі, ён, астаючыся сам сабой, лье цэбры памыяў на маладыя комуністычныя кадры ў навуцы.

Адкуль бярэцца дваістасць Гранатава? Чым тлумачыцца, што нават тады, калі Гранатаў хоча быць аб'ектыўна сумленным, усё-ж вельмі лёгка распазнаць яго сапраўднае нутро.

Гранатаў, парваўшы з контррэвалюцыйнай арганізацыяй «Русь і воля», быў-бы вельмі рад забыць сваё мінулае, але адначасова ён баіцца расказаць аб сваім удзеле ў гэтай арганізацыі. Утаіўшы ад совецкай улады сваё мінулае, ён тым самым дае магчымасць розным нягоднікам тыпа Ліхомскага і Рэдуткіна шантажыраваць сябе, вымаць у яго грошы ў аплату за маўчанне.

Гранатаву тэатр процістаўляе прадстаўніка старой інтэлігенцыі праф. Андросава, чэснага чалавека, адданага совецкай уладзе, які радасна і з энтузіязмам нясе свае веды пролетарыяту, Гранатаву тэатр процістаўляе грамаду навуковых працаўнікоў, маладых аспірантаў, авалодваючых вышынямі навукі, выкрываючых агідную работу свайго прафесара і прымушаючых яго самаразаблачыцца на сваім публічным дакладзе на тэму: «Інтэлігенцыя і рэвалюцыя».

Вось у кароткіх словах змест гэтай захапляючай пастаноўкі, раскрываючай усю сутнасць унутранай эміграцыі.

У гэтым спектаклі тэатр зноў паказаў, што ён з'яўляецца тэатрам актора, тэатрам вялікага тэатральнага майстэрства. Заслужаны артыст **Музапеўскі** ў ролі праф. Гранатава іграе сакавіта, шырока, свабодна, увесь час прыкоўвае да сябе ўвагу глядача, нават калі ён (глядач) заліваецца смехам пасля кожнай рэплікі Рэдуткіна (артыст **Орлоў**).

Захапляюча іграе 14-гадовага хлопчыка Гогу заслужаная артыстка **Бабанава**, якая на гэты раз паказвае сваю здольнасць іграць чалавечую драму. Гога—скалечаны эміграцыяй хлапчук, які імкнецца паказаць слое еўрапейскім джэнтльменам, але фактычна нічога сабой не прадстаўляе. Адарваны ад совецкай глебы, пазбаўлены совецкіх таварышоў-аднагодак, Гога з'яўляецца фактычна беспритульным. Бацьку свайго—праф. Гранатава ён амаль не ведае, але інтуітыўна не любіць яго, старонніца і палохаецца яго.

Бабанава прасякае ў самыя глыбіні псіхікі не толькі персанажа, але і ў глыбіню псіхікі падросткаў эміграцкай сапраўднасці, расшыфроўвае гэтым самым вобраз Гогі і адначасова ўзбройвае глядача пачуццём агіды да эміграцкага балота.

Высока мастацкай ігрой з вычапальнай паўнатой Бабанава ўскрывае ўродлівае выхаванне дзяцей з межнай эміграцыі, дапаўняючы адначасова Г. В. Музалеўскага, які ў асобе праф. Гранатава паказвае ўнутраную эміграцыю.

О. ПЫЖОВА у ролі Ксеніі Траверн („Человек с портфелем")

Вобраз Гранатата і Гогі не быў-бы поўным, калі-б заслужаная артыстка **Пыжова** ў ролі Ксеніі Траверн (жонкі Гранатава) не перадала-б усю адарванасць эміграцыі ад совецкай рэчаіснасці, яе абсалютнае неразуменне сэнсу падзей. Пыжова правільна паказвае Ксеню такой, што ў яе больш гістэрычнай бяздзейнасці, чым злошкодніцкасці. Толькі вярнуўшыся ў Маскву і зірнуўшы сапраўднасці ў вочы, яна ўбачыла тую прорву, якая вырасла паміж ёю і жывым жыццём, і рашэнне пакончыць самагубствам было апошнім яе эміграцкім рашэннем. Майстэрская ігра Пыжовай вельмі дапамагла раскрыццю яшчэ аднаго прадстаўніка эміграцыі.

Молада, свежа і па характару вобраза, і па якасці выканання падаў **Сапаўёў** аспіранта Топанова.

Беспадобен **Орлоў** у ролі Рэдуткіна, які выклікае пачуццё пагарды да яго; ён больш смешыць аўдыторыю, чым прымушае абурацца. Гумар Орлова выкрывае Рэдуткіна, смех глядача яго знішчае канчаткова.

Падкрэсліваем, у гэтай пастаноўцы тэатр зноў пацвердзіў, што ён з'яўляецца тэатрам акторскага майстэрства.

Марчэнка ў ролі маткі Гранатава, **Кірылаў** у ролі Ліхомскага, **Рапіна** ў эпізадычнай ролі Марыі Панфілавай, **Латышэўскі** ў ролі Андросава, **Просіна** ў ролі Башкіравай—кожны з іх, якое-б ён не займаў месца ў спектаклі, паказаў сябе высококваліфікаваным акторам, захапляючым і прыкоўваючым да сябе увагу аўдыторыі.

В. МАРЧЭНКО ў ролі маткі Гранатава („Человек с портфелем")

Іменна таму, што «Человек с портфелем» іграе такі майстэрскі акторскі калектыў, спектакль, пастаўлены ў 1927 годзе, ні на адну яту не страціў і ў наш час ні сваёй палітычнай, ні мастацкай вартасці.

Л. КАПЛАН.

ПАПРАЎКА

У «Звяздзе» за 26 чэрвеня (№ 138) у прамове тав. М. І. КАЛІНІНА па тэхнічнаму недагляду выпаў канец другога абзаца другой калонкі. Гэты абзац трэба чытаць: «Кожны комуніст і кожны чэсны совецкі грамадзянін павінен разумець, што ён з'яўляецца ахоўцам комуністычнага сцяга, комуністычнага светапогляду, што ён падымае сцяг Совецкага Саюза—першай пролетарскай дзяржавы. Усё гэта і павялічыла да аграмадных размераў сілу супраціўляемасці таварышоў, якія знаходзіліся на ільдзіне, дапо магчымасць праявіць тыя арганізацыйныя здольнасці, якія выявіў тав. Шмідт. У гэтым наша перамога. Я лічу, што гэта страта—гібель карабля—разам з тым дэманстравала перад усім светам аграмадны не толькі тэхнічны, але і арганізацыйны вопыт, накоплены Совецкім Саюзам. Праяўленне арганізаванасці, дысцыпліны і выноснівасці чэлюскінцаў упічваецца ўсім светам».

5 ЛІПЕНЯ Ў МЕНСКУ СКЛІКАЕЦЦА ІХ ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ЛКСМБ З ПЫТАННЕМ:

ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ ПЕРАВЫБАРАЎ ПЯРВІЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ДАЛЕЙШЫЯ ЗАДАЧЫ РАБОТЫ ЛКСМБ ПА ПЕРАБУДОВЕ Ў СУВЯЗІ З ПАКАЗАННЕМ ТАВ. КОСАРЭВА (ДАКЛ. т. СТУКАЛАЎ).

НА ПЛЕНУМ ВЫКЛІКАЮЦЦА: ЧЛЕНЫ І КАНДЫДАТЫ ЦК, САКРАТАРЫ ГК І РК ЛКСМБ, ПАМНАЧПАЛІТАДДЗЕЛАЎ ПА КОМСАМОЛУ МТС, СОЎГАСАЎ І ТРАНСПАРТА, А ТАКСАМА 20 АРГАНІЗАТАРАЎ ПЯРВІЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЛКСМБ (ПА АСОБНАЙ РАЗВЕРСТЦЫ).

САКРАТАР ЦК ЛКСМБ АЎГУСТАЙЦІС.

Кіно „СПАРТАК" Ад 1 ліпеня выдатны фільм (нямы варыянт)
ЗЛАТЫЯ ГОРЫ
драма ў 6 частках.
У праграме кіно-хроніка
Штодзённа 4 сеансы. Каса—з 4 гадз. дня

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Гукавы мастацкі фільм СУРОВЫЯ ДНІ На летняй эстрадзе канцэртнае аддзяленне

Кіно Інтэрнацыянал — Сёння новая праграма

КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" АНОНС! ГРАНДЫЁЗНЫ АТРАКЦЫЁН Ад 3-га ліпеня Одзіная у СССР ЖАНЧЫНА-ТРАНСФАРМАТАР ЗОЯ КАВЕЦКАЯ

Згодна загада Наркамзема БССР ад 20 чэрвеня 1934 г. за № 315.

Белжывкалгасаб'яднанне з 1 ліпеня 1934 г. ліквідуецца.

Арганізацыям, маючым прэтэнзіі да Белжывкалгасаб'яднання, прапануецца прад'явіць ліквідкому не пазней 15 ліпеня 1934 г. па адрасу: г. Менск, Дом Урада, пакой 16 116.

Пасля ўказанага тэрміна ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць. **Ліквідком.**

Менскі рабфак Ленінградскага Аўтадарожнага Інстытута аб'яўляе **АСЕННІ ПРЫЁМ** на ўсе курсы дзённага і вечарняга аддзялення рабфака. Усе паступаючыя трымаюць іспыты па ўстаноўленай праграме ў аб'ёме на 1 курс—5 груп. на 2 дзённы—7 груп. на 3 дзённы—8-9 груп. на 2 вяч.—ва 6 груп. на 3 вячэрні за 7-8 груп. Студэнты дзённага аддзялення забяспечваюцца стыпендыяй, сталовай і інтэрнатам.

Да заявы неабходна прыкласці дакументы ў арыгінадах: аб нараджэнні, даведку аб сацыяльным паходжанні, становішчы, стажы работы самога паступаючага і яго бацькоў, аб асвеце, аб здароўі паступаючага, адзе фотакарткі, камандыроўку прадпрыемства, заверараную анкету і паштовых марак на 60 кап.

Іспыты адбудуцца з 22 па 27 жніўня. Заняткі пачнуцца з 1 верасня. Заявы прымаюцца да 15 жніўня. Дакументы накіроўваць па адрасу: Менск, універсітэцкі гарадок, анатамічны корпус, пакой 110. Аўтадарожны рабфак.

Дырэкцыя.

Чэрыкаўскі Дзяржаўны ветэрынарны тэхнікум, які рыхтуе памветдактароў для жывёлагадоўлі, аб'яўляе **АСЕННІ ПРЫЁМ** на 1 КУРС

Прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодку або маючыя веды ў аб'ёме сямігодкі ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў. Да заявы да даць: засведчаную анкету, даведку аб соц становішчы і паходжанні, пасведчанне аб адукацыі і даведкі аб узросце і стане здароўя, копію вайсковага білета і 40 кап. паштовымі маркамі. Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам, сталоўкай і прачэчнай. Прыём заяў—да 15 жніўня з 25 па 30 жніўня—іспыты па выкліку. Заявы і дакументы накіроўваць па адрасу гор. Чэрыкаў, ветэхнікум.

Дырэкцыя.

Менскі Усесаюзны хімікатэхналагічны тэхнікум прамысловага хлебапячэння аб'яўляе **ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ** на дзённае аддзяленне ў колькасці 120 чал.

Тэхнікум з'яўляецца ўсесаюзным і рыхтуе тэхнікаў-тэхнолагаў для прамысловага хлебапячэння розных гарадоў Совецкага Саюза.

Для паступлення ў тэхнікум трэба прадставіць наступныя дакументы: аб узросце, аб соцпаходжанні, праве голаса, аб ск анчэнні 7-годкі, аб працоўным стажы паступаючага і яго бацькоў і размеры заработку, аб размеры сельгаспадатку, а для калгаснікаў—аб часе ўступлення ў калгас, аб стане здароўя, заверараную анкету і 2 фотакарткі.

Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 30 год.

Іспыты ў аб'ёме сямігодкі па матэматыцы, фізіцы, хіміі, грамадазнаўству і беларускай мове.

Пачатак заняткаў з 1 верасня.

Заявы прымаюцца штодзённа з 10 гадзін раніцы да 5 гадзін вечара па адрасу: Менск, Подгорны завулак, дом № 7.

Прынятыя забяспечваюцца інтэрнатам пасцельнымі прыладамі і сталовай і стыпендыяй.

Дырэкцыя тэхнікума.

Гомельскі зоатэхнічны тэхнікум (з ухілам паконгадоўлі на апошнім курсе) абвяшчае **АСЕННІ НАБОР** студэнтаў на 1 курс—90 чал., на другі курс—10 чал., на трэці—10 чал.

Тэхнікум рыхтуе зоатэхнікаў сярэдняй кваліфікацыі па спецыялізацыях па конегадоўлі для работы на конзаводах ў дзяржаўных заводскіх канюшнях, буйных конегадоўчых калгасных фермах і раённых земельных органах у якасці зоатэхнікаў. Тэрмін навучання 3 г. 8 мес. У тэхнікум прымаюцца працоўныя і іх дзеці ва ўзросце ад 16 да 30 год. Да заявы трэба прыкласці наступныя дакументы аб асвеце, аб соцыяльным і матэрыяльным становішчы бацькоў і самога паступаючага, аб узросце, аб адносінах да вайсковай павіннасці, аб здароўі заверараную анкету, 2 заверараных фотакарткі і паштовых марак на 40 кап. Заявы прымаюцца да 1 верасня. Іспыты ў аб'ёме 7 годкі будуць праводзіцца па грамадазнаўству, роднай мове, матэматыцы, фізіцы і хіміі з 20 жніўня. Пачатак заняткаў 1 кастрычніка. Прынятыя ў тэхнікум будуць забяспечаны стыпендыяй, інтэрнатам і сталовай.

Заявы накіроўваць па адрасу: БССР, г. Гомель, 59 конзавод, Зоатэхнічнаму тэхнікуму.

Дырэкцыя.

Рэдакцыі газ. „ЗВЯЗДА" **ПАТРЭБНА** КВАЛІФІКАВАНАЯ МАШЫНІСТКА. Звярачацца: Совецкая, 63, 2-гі паверх

Абавязковая пастанова № 21

Менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

19 чэрвеня 1934 г. гор. МЕНСК.

Пра перацірку і афарбоўку фасадаў дамоў у горадзе Менску

Менскі гарадскі совет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усе жакты, дзяржаўныя, кааператыўныя і грамадскія ўстановы і арганізацыі, а таксама прыватных домаўласнікаў да 10 ліпеня 1934 г. прывесці ў належны парадак фасады дамоў, брам шляхам пераціркі, папраўлення штукатуркі, афарбоўкі сцен, рамонту карнізаў, балконаў і вадасточных труб.
2. Колер афарбоўкі ўстанаўляецца выключна кіраўніцтвам добрабыту Менгорсовета.
3. Сістэматычна мыць вокны, дзверы ад бруду і пылу.
4. Нагляд за ўсімі вышэйпаказанымі работамі ўскладаецца на кіраўніцтва добрабыту Менгорсовета.
5. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на РСміліцыю.
6. Вінаватыя ў парушэнні гэтай пастановы прыцягваюцца да адміністратыўнай адказнасці — штр